***ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ***

# ГІСТОРЫЯ КРАЯЗНАЎСТВА І КРАЯЗНАЎЧАЙ БІБЛІЯГРАФІІ
**1-23 01 11 – Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)**

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

Курсы 3-4

Семестр VI-VII

Лекцыі 34

Практычныя (семінарскія)
заняткі 38 — Залік VI, VII

Аўдыторных гадзін па
вучэбнай дысцыпліне 80

Усяга гадзін па
вучэбнай дысцыпліне 190 — Форма атрымання вышэйшай адукацыі дзённая

Склала Валянціна Іванаўна Саітава, кандыдат педагагічных навук. дацэнт

Вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове вучэбнай праграмы “Гісторыя краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі” 2014 г. № ВД-015/баз.

Разгледжана і рэкамендована да зацвярджэння кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый
(пратакол № 3 ад 16.10.2015 г.)

Загадчык кафедры

__________В.А. Касап

Минск
2015

Репозиторий БГУКИ

**ЗМЕСТ**

Рабочая праграма
Вучэбна-метадычная карта
Метадычныя ўказанні для семінараў
Метадычныя ўказанні да практычных заняткаў
Метадычныя ўказанні для самастойнай работы студэнтаў
Пытанні і заданні для самаправеркі па асноўных раздзелах дысцыпліны
Тэсты для самаправеркі студэнтаў
Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў
Умовы выкарыстання рэйтынгавай сістэмы
Тэмы курсавых і дыпломных работ
Літаратура
Пытанні да заліку
Крытэрыі ацэнкі ведаў,уменняў і навыкаў па дысцыпліне
Выкарыстанне тэхнічных сродкаў

Репозиторий БГУКИ

## РАБОЧАЯ ПРАГРАМА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Згодна вучэбнага плана дысцыпліна “Гісторыя краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі” вывучаецца студэнтамі ФБІС спецыялізацыі “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” як дысцыпліна спецыялізацыі.

Актуальнасць дысцыпліны абумоўлена павышэннем ролі краязнаўчай дзейнасці бібліятэк на сучасным этапе, уплывам гісторыка-краязнаўчых ведаў на фарміраванне інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення студэнтаў бібліятэкараў.

Асноўнай мэтай дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне студэнтамі беларускага краязнаўства як гісторыка-культурнага феномена.

Мэта абумовіла задачы, рэалізацыя якіх забяспечвае фарміраванне неабходных **ведаў і ўменняў**, а менавіта:

- вызначыць асноўныя перыяды развіцця краязнаўства ў Беларусі, паказаць значэнне рэгіёнаў і іх насельніцтва як аб’ектаў і суб’ектаў гістарычнага працэсу;
- раскрыць станаўленне асобных арганізацыйных формаў краязнаўства: грамадскага, дзяржаўнага, школьнага; іх дасягненні, асаблівасці і ўзаемасувязі, мэты і метады дзейнасці;
- паказаць кірункі краязнаўчых даследаванняў на кожным гістарычным этапе і рэалізацыю іх галоўных вынікаў у дакументальнай форме, што прадстаўляе асаблівую значнасць для бібліятэчных работнікаў.

У выніку засваення курса студэнты павінны **ведаць**:

- арганізацыю і агульны стан краязнаўчай дзейнасці ў асобныя гістарычныя перыяды;
- выдатных краязнаўцаў і арганізацыі, якія ўнеслі значны ўклад у даследаванне асобных рэгіёнаў і папулярызацыю краязнаўчых ведаў;
- змястоўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў у асобныя перыяды і асноўныя краязнаўчыя крыніцы;

**ўмець**:

- выкарыстоўваць гістарычныя веды па краязнаўстве ў прафесійнай дзейнасці;

Репозиторий БГУКИ

- выкарыстоўваць вядомыя факты пры разглядзе прычынна-выніковых сувязей гісторыі краязнаўства;

- выяўляць суб’ектаў розных формаў краязнаўства, пазнавальнай і асветніцкай дзейнасці па вывучэнні рэгіёнаў у асобныя гістарычныя перыяды;

- выяўляць і аналізаваць дакументальную спадчыну гісторыка-краязнаўчага вывучэння рэгіёнаў.

Для вывучэння “Гісторыі краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі” неабходна засваенне шэрагу дысцыплін, у т. л. “Гісторыі Беларусі”, “Гісторыі кнігі”, “Бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства”, дысцыплін па вывучэнні матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Асноўныя віды заняткаў па дысцыпліне: лекцыі, семінары, практычныя работы; праводзіцца кантроль за самастойнай працай студэнтаў. Вывучэнне курса студэнтамі завяршаецца залікам.

Репозиторий БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
"ГІСТОРЫЯ КРАЯЗНАЎСТВА І КРАЯЗНАЎЧАЙ БІБЛІЯГРАФІІ"

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | Уводзіны | 0,5 | | | | | | |
| | **Раздзел I. Значэнне рэгіянальнага падзелу краіны ў краязнаўстве** | | | | | | | |
| 1 | Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах | 1 | | | | 6 | | |
| 2 | Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель і Беларусі ў асобныя гістарычныя перыяды | 2 | | | | | | |
| | **Раздзел II. Узнікненне краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (да 1794 г.)** | | | | | | | |
| 3 | Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў | 1 | | | | 6 | | |
| 4 | Узнікненне рэгіянальных геаграфічных і прыродазнаўчых апісанняў і даследаванняў | 1 | | 2 | | 6 | | |
| 5 | Узнікненне краязнаўчай бібліяграфіі | 0,5 | | | | | | |
| | **Раздзел IV. Краязнаўства ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі (1795 – 1917 гг.)** | | | | | | | |
| 6 | Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1795 – 1863 гг. | 2 | | | | | | |
| 7 | Кірункі краязнаўчых даследаванняў у 1795 – 1863 гг. | 1 | | 2 | | 8 | | |

Репозиторий БГУКИ

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 8 | Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1864 – 1917 гг. | 2 | | | | | | |
| 9 | Кірункі краязнаўчых даследаванняў ў 1864 – 1917 гг. | | | 2 | | 8 | | |
| 10 | Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі | 0,5 | | | | | | |
| | **Раздзел V. Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі (1918 – 1980-я гг.)** | | | | | | | |
| 11 | Арганізацыя краязнаўства ў БССР у міжваенны перыяд (1918 – чэрвень 1941 гг.), яго страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны | 2 | | | | 8 | | |
| 12 | Кірункі краязнаўчых даследаванняў у БССР у міжваенны перыяд (1918 – чэрвень 1941 гг.) | 2 | | 2 | | | | |
| 13 | Краязнаўчая дзейнасць у Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) | 1 | | 2 | | 4 | | |
| 14 | Аднаўленне краязнаўчай дзейнасці ў БССР і яе арганізацыя ў 1945 – 1980-я гг. | 2 | | | | 6 | | |
| 15 | Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў у БССР у 1945 – 1980-я гг. | 1 | | 2 | | 6 | | |
| 16 | Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі | 0,5 | | | | | | |
| | **Раздзел VI. Развіццё краязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь (1991 – 2010-я гг.)** | | | | | | | |
| 17 | Развіццё грамадскага краязнаўчага руху | 2 | | | | 8 | | |
| 18 | Развіццё школьнага і дзяржаўнага краязнаўства | 2 | | 2 | | | | |
| 19 | Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў | 4 | 10 | 4 | | 12 | | |
| | Усяго | 28 | 10 | 18 | | 78 | | |

Репозиторий БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ

Мэты, задачы вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі”. Яе значэнне і месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнавуковага і прафесійнага цыклаў. Забяспечанасць вучэбна-метадычнымі матэрыяламі.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Гістарычная перыядызацыя беларускага краязнаўства. Характарыстыка асноўных раздзелаў вучэбнай дысцыпліны. Формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

### Раздзел I. ЗНАЧЭННЕ РЭГІЯНАЛЬНАГА ПАДЗЕЛУ КРАІНЫ Ў КРАЯЗНАЎСТВЕ

#### Тэма 1. Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах

Характарыстыка прымет, па якіх здзяйсняецца падзел краіны на рэгіёны.

Значэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу краіны.

Значэнне прыродна-геаграфічнага раяніравання і прыметы, па якіх яно ажыццяўляецца. Асноўныя прыродна-геаграфічныя правінцыі: Беларускае Паазер’е, Беларуская Узвышанасць, Перадпалессе, Прыдняпроўе (Усходне-Беларуская правінцыя), Палессе. Прыродныя запаведнікі і заказнікі.

Асаблівасці эканамічнага раяніравання; эканамічныя раёны, свабодныя эканамічныя зоны на сучасным этапе.

Выкарыстанне ў краязнаўчых даследаваннях этнічнай і канфесійнай прымет.

#### Тэма 2. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель і Беларусі ў асобныя гістарычныя перыяды

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель у ВКЛ. Стварэнне ваяводстваў і паветаў, уплыў рэформы 1565 – 1566 гг. на фарміраванне ўстойлівай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры краіны.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель у Расійскай імперыі.

Развіццё адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР у міжваенны і пасляваенны перыяды.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь.

Кароткатэрміновыя структуры адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў гады ваеннай інтэрвенцыі, створаныя акупацыйнымі ўладамі ў ХХ ст. (1918-1920 гг., 1941 – 1944 гг.)

Репозиторий БГУКИ

## Раздзел II. УЗНІКНЕННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (да 1794 г.)

### Тэма 3. Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў

Грамадзянскі патрыятызм як рыса народнай свядомасці ліцвінаў-беларусаў і фактар вывучэння айчынных зямель. Яго выказванне Ф. Скарынай, М. Гусоўскім і іншымі знакамітымі дзеячамі.

Беларускія тэрыторыі ў летапісах і хроніках, першых гістарычных даследаваннях XV – XVI стст. Хронікі і летапісы асобных беларускіх рэгіёнаў: “Баркулабаўскі летапіс”, “Хроніка горада Магілёва”, “Хроніка горада Віцебска”. Дзейнасць М. Стрыйкоўскага, А. Гваньіні, Я. Ласіцкага па вывучэнні гісторыі беларускіх зямель, жыцця насельніцтва; публікацыя вынікаў іх даследаванняў (“Аб пачатках, паходжанні, справах рыцарскіх і дамовых слаўнага народу літоўскага, жамойцкага і рускага”, “Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсёй Русі” і інш.)

Гісторыка-краязнаўчыя даследаванні ў XVII – XVIII стст. Дзейнасць І. Сцябельскага па вывучэнні гісторыі хрысціянства на Полаччыне.

Беларускія краі ў мемуарнай літаратуры XVI – XVIII стст. (прадстаўнікоў роду Радзівілаў, К. Завішы, Я. Храпавіцкага, М. Матушэвіча і інш.)

Першыя археалагічныя раскопкі ў Бельчыцкім манастыры, маёнтку Мосар.

Узнікненне краязнаўчай бібліяграфіі.

### Тэма 4. Узнікненне рэгіянальных геаграфічных і прыродазнаўчых апісанняў і даследаванняў

Узнікненне картаграфавання і прыродна-геаграфічных апісанняў беларускіх зямель. Беларускія тэрыторыі на картах Мікалая з Кузы, Б. Вапоўскага, Т. Макоўскага, у працах Я. Длугаша і апісаннях падарожнікаў.

Вывучэнне прыроды Гарадзеншчыны, Віленшчыны і іншых беларускіх рэгіёнаў Ж.Э. Жыліберам, яго даследаванне “Флора Літвы”. Прыродазнаўчыя даследаванні Б.С. Юндзіла. Аматарскія прыродазнаўчыя калекцыі М. Агінскага, І.Л. Храптовіча. Праграма па збіранні матэрыялаў па гісторыі прыроды рэгіёнаў Таварыства па стварэнні падручнікаў Адукацыйнай камісіі. Праект выдання рэгіянальных календароў І. Масальскага.

### Тэма 5. Узнікненне краязнаўчай бібліяграфіі

Узнікненне несамастойных формаў краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі ў выданнях, прысвечаных літоўска-беларускім землям.



Репозиторий БГУКИ

Краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы ў выданнях Статута ВКЛ і зборніках канстытуцый, гербоўніках шляхты, навуковых выданнях і інш. Бібліяграфічнае аснашчэнне краязнаўчых кніг І.Сцябельскага.

## Раздзел ІІІ. КРАЯЗНАЎСТВА Ў ПЕРЫЯД УВАХОДЖАННЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1795 – 1917 гг.)

### Тэма 6. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1795 – 1863 гг.

Уздзеянне грамадскіх фактараў, урадавай палітыкі на развіццё краязнаўчага руху ў Беларусі. Характарыстыка навукова-адукацыйнай, грамадскай і дзяржаўнай структур краязнаўства.

Роля Віленскага універсітэта ў вывучэнні мінулага рэгіёнаў ВКЛ. Дзейнасць Полацкай езуіцкай акадэміі па вывучэнні г. Полацка і яго ваколіц. Краязнаўчыя матэрыялы ў “Месячніку полацкім.” Краязнаўчы кірунак у дзейнасці Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

Удзел прадстаўнікоў магнатэрыі, шляхты і духавенства ў вывучэнні беларускіх рэгіёнаў. Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх таварыстваў: кола графа М.П. Румянцава, Беларускага вольнага эканамічнага таварыства, Віленскай археалагічнай камісіі. Удзел беларускіх краязнаўцаў у Расійскім геаграфічным таварыстве, Археаграфічнай камісіі і іншых грамадскіх арганізацыях.

Заснаванне прыватных краязнаўчых музеяў: графамі Тышкевічамі ў Лагойску, К. Тызенгаўзам у Паставах і інш. Віленскі музей старажытнасцей як буйнейшы цэнтр краязнаўства перыяду.

Адлюстраванне краязнаўчых даследаванняў мясцовага насельніцтва ў друку.

Арганізацыя губернскіх статыстычных камітэтаў, іх роля ў зборы мясцовай інфармацыі. Адкрыццё Віленскага і Віцебскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг (1852 г.). Стварэнне мясцовай афіцыйнай прэсы, краязнаўчыя публікацыі на яе старонках.

Удзел афіцэраў Генеральнага штаба ў зборы краязнаўчых матэрыялаў аб беларускіх мясцовасцях і іх выданне. Віленская, Гродзенская, Мінская, Смаленская губерні ў “Матэрыялах для геаграфіі і статыстыкі Расіі…”.

### Тэма 7. Кірункі краязнаўчых даследаванняў у 1795 – 1863 гг.

Уздым інтарэсу да гістарычных, археалагічных, этнаграфічных апісанняў і даследаванняў беларускіх рэгіёнаў.

Выяўленне і публікацыя актавых дакументаў, прысвечаных рэгіёнам Беларусі (“Беларускі архіў старажытных грамат” І. Грыгаровіча, “Скарбец дыпломаў” І. Даніловіча, зборнікі дакументаў Археаграфічнай камісіі).

Гісторыка-краязнаўчыя і археалагічныя даследаванні Т. Нарбута, К. Тышкевіча, Я. Тышкевіча, А. Кіркора і інш. Этнаграфічнае вывучэнне

Рэпазіторый БГУКІ

рэгіёнаў, дзейнасць па зборы фальклорнага матэрыялу (З. Даленга-Хадакоўскі, Я. Чачот і інш.)

Прыродазнаўчыя даследаванні рэгіёнаў (А. Плятар, К. Тышкевіч, К. Тызенгаўз).

Публікацыя комплексных даследаванняў рэгіёнаў і населеных пунктаў К. Тышкевіча, П. Шпілеўскага, У. Сыракомлі.

Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі.

## Тэма 8. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1864 – 1917 гг.

Заняпад краязнаўчага руху ў 1864 – 70-х гг. Закрыццё устаноў і арганізацый, якія займаліся краязнаўчымі даследаваннямі. Рэпрэсіі супраць краязнаўцаў удзельнікаў паўстання 1863 – 1864 гг. і спачуваўшых яму. Актывізацыя краязнаўчага руху ў канцы XIX – пачатку XX стст., пашырэнне складу краязнаўцаў. Уплыў "наша-ніўскага" адраджэння на на ўздым мясцовага краязнаўчага руху.

Агульная характарыстыка зменаў у арганізацыйных структурах краязнаўства. Узмацненне дзяржаўнага краязнаўства. Дзейнасць Віленскага і Віцебскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг па публікацыі гістарычных дакументаў аб рэгіёнах Беларусі. Пашырэнне кірункаў краязнаўчай дзейнасці губернскіх статыстычных камітэтаў. Публікацыя даведачных і статыстычных матэрыялаў: "Памятных кніжак…" і "Аглядаў…" губерняў і інш.

Развіццё грамадскага краязнаўчага руху. Краязнаўчая дзейнасць навуковых і грамадскіх арганізацый: Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, Таварыства вывучэння Магілёўскай губерні, Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі (Мінск), царкоўна-археалагічных камітэтаў і інш. Удзел беларускіх краязнаўцаў у рабоце Польскага краязнаўчага таварыства (ПКТ).

Прыватныя музеі А. Ельскага, Э. Чапскага, іх краязнаўчыя зборы.

Роля перыядычнага друку ў распаўсюджанні краязнаўчых ведаў. Рэгіянальная інфармацыя на старонках мясцовага друку. Краязнаўчыя матэрыялы ў мясцовай афіцыйнай прэсе, у выданнях навуковых і краязнаўчых таварыстваў, прыватных перыядычных і прадаўжальных органах (губернскія і епархіяльныя ведамасці, "Запіскі Рускага археалагічнага таварыства", "Край", "Зямля", "Вандровец", "Літва і Русь", "Віцебская даўніна", "Магілёўская даўніна", "Мінская даўніна", "Наша Ніва" і інш.)

Школьнае краязнаўства. Удзел настаўнікаў і навучэнцаў школьных устаноў рознага тыпу ў зборы краязнаўчых матэрыялаў па заданнях арганізацый і выкарыстанне краязнаўчых формаў у выхаваўчай дзейнасці.

Выдатныя краязнаўцы перыяду: Д.І. Даўгяла, М.В. Доўнар-Запольскі, А.С. Дэмбавецкі, А.К. Ельскі, Я.Ф. Карскі, І.А. Луцкевіч, М.Я. Нікіфароўскі,

Рэпазіторый БГУКИ

Е.Р. Раманаў, А.П. Сапуноў, А.М. Семянтоўскі, А.П. Смародскі, А.М. Уласаў, В.А. Шукевіч, П.В. Шэйн і інш.

### Тэма 9. Кірункі краязнаўчых даследаванняў у 1864 – 1917 гг.

Кірункі гістарычных, археалагічных, фальклорна-этнаграфічных, геаграфічных даследаванняў і апісанняў беларускіх зямель.

Мясцовыя дакументы ў выданнях архіўных матэрыялаў Віленскай археаграфічнай і Віцебскай вучоных архіўных камісій, Віленскага і Віцебскага цэнтральных архіваў: “Акты, выдаваемыя Віленскаю камісіяй…”, “Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы…”, “Вопіс дакументаў Віленскага цэнтральнага архіву старажытных актавых кніг”. Публікацыя апісанняў архіваў асобных манастыроў і гарадоў.

Краязнаўчая тэматыка на 9-м археалагічным з’ездзе (Вільня, 1893 г.); уплыў з’езда на актывізацыю гісторыка-краязнаўчых даследаванняў, вывучэнне матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва беларускіх губерняў.

Краязнаўчыя гістарычныя і фальклорна-этнаграфічныя даследаванні П.В. Шэйна, М.Я. Нікіфароўскага, А.П. Сапунова, А.М. Сементоўскага, Г.Х. Татура, Е.Р. Раманава, М.В. Доўнар-Запольскага, В.А. Шукевіча, Б.І. Эпімах-Шыпілы і інш.

Кірункі геаграфічных і прыродазнаўчых даследаванняў. Беларуская тапаграфіка ў “Слоўніку геаграфічным Каралеўства Польскага…” (1880 – 1902), роля А.К. Ельскага ў падрыхтоўцы звестак для выдання; у 9 томе выдання “Расія – поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны” (1905). Даследаванні А.П. Сапунова (манаграфія “Рака Заходняя Дзвіна”); В.Н. Шніткова (“Птушкі Мінскай губерні” і інш.) Прырода Белавежскай пушчы, Палесся і іншых беларускіх рэгіёнаў у апісаннях А.П. Смародскага, А.П. Сапунова, А.Б. Місуны, П.А. Туткоўскага, Ю. Пачоскага.

Краязнаўчыя даследаванні прыроды і сельскай гаспадаркі, праведзеныя Мінскім таварыствам аматараў прыродазнаўства і іншымі грамадскімі таварыствамі.

Арганізацыя рэгіянальных медыцынскіх таварыстваў, правядзенне імі антрапаметрычных даследаванняў насельніцтва і вывучэнне пытанняў рэгіянальнай паталогіі.

Узнікненне краязнаўчай фатаграфіі як кірунка фотамастацтва; уклад Я. Булгака. Беларускія мясцовасці на фатаграфіях Я. Балзункевіча і іншых майстроў.

### Тэма 10. Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі

Узнікненне краязнаўчых збораў у прыватных бібліятэках, бібліятэках вышэйшых навучальных устаноў у першай палове XIX ст. Першая спецыялізаваная бібліятэка, прысвечаная Паўночна-Заходняму краю і асобным яго мясцінам у складзе Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі. Бібліяграфічныя агляды ў кнігах К.І.Грум-Гржымайла

Репозиторий БГУКИ

"Про колтун", А.Рыпінскі "Беларусь" (1840) і інш. "Бібліятэка пісьменнікаў Полацкай часткі"Д.Браўна.

Стварэнне краязнаўчых бібліятэк (краязнаўчых калекцый у бібліятэках) у другой палове XIX – пачатку XX ст. Бібліятэка Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Выпуск краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў, прысвечаных невялікім беларускім тэрыторыям. Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі П.А.Чарнеўскага, З.М.Пенкінай, А.П.Смародскага. Краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя ў газеце "Наша Ніва".

## Раздзел V. КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ (1918 – 1980-я гг.)

### Тэма 11. Арганізацыя краязнаўства ў БССР у міжваенны перыяд (1918 – чэрвень 1941 гг.), яго страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Станоўчы ўплыў новых нацыянальных устаноў навукі, вышэйшай адукацыі, культуры, дзяржаўных органаў на развіццё беларусазнаўства і краязнаўства. Роля Інбелкульта ў арганізацыі краязнаўчых даследаванняў. Дзейнасць галіновых секцый Інбелкульта па кіраванні краязнаўчымі даследаваннямі, іх правядзенні, навукова-метадычным забеспячэнні.

Роля Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК) пры Інбелкульце па арганізацыі грамадскага краязнаўчага руху; галоўныя кірункі яго дзейнасці. Краязнаўчыя з'езды і канферэнцыі. Стварэнне сеткі грамадскіх краязнаўчых арганізацый. Краязнаўчы друк. Часопіс "Наш край". Мясцовыя краязнаўчыя выданні ("Віцебшчына", "Магілёўшчына", "Асіповіцкі раён", "Горацкі раён").

Удзел у краязнаўчым руху ВНУ і музеяў. Развіццё краязнаўчай дзейнасці ў школах.

Выдатныя краязнаўцы перыяду: М.І. Каспяровіч, У.І. Пічэта, Я.К. Бялькевіч, І.А. Сербаў, М.В. Мялешка, П.Ф. Салаўёў і інш.

Рэпрэсіі ўладаў супраць краязнаўчага руху і краязнаўцаў у 30-я гг., заняпад краязнаўства на Беларусі.

Страты краязнаўства падчас Вялікай Айчыннай вайны (знішчэнне краязнаўчых музеяў, вываз гісторыка-краязнаўчых каштоўнасцей і інш.)

### Тэма 12. Кірункі краязнаўчых даследаванняў у БССР у міжваенны перыяд (1918 – чэрвень 1941 гг.)

Асноўныя кірункі і вынікі гісторыка-краязнаўчых даследаванняў: адкрыцці і працы А.М. Ляўданскага, С.А. Дубінскага, К.М. Палікарповіча, В.М. Дружчыца, У.І. Пічэты, М.В. Доўнар-Запольскага і інш. Удзел гістарычных камісій польскага і яўрэйскага аддзелаў Інбелкульта ў зборы краязнаўчых матэрыялаў.

Краязнаўчыя фальклорна-этнаграфічныя даследаванні А. Сержпутоўскага, М.В. Мялешкі, П.К. Харламповіча, І.А. Сербава, А.А. Шлюбскага.

Репозиторий БГУКИ

Краязнаўчыя моўныя даследаванні Інбелкульта, ЦБК і мясцовых краязнаўчых арганізацый. Укладанне краёвых слоўнікаў М.І. Каспяровічам, А.Я. Крукоўскім, Я.К. Бялькевічам, М. Шатэрнікам.

Краязнаўчыя даследаванні прыроды. Вынікі экспедыцый і працы А.У. Фядзюшына, А.А. Смоліча, В.Ф. Купрэвіча. Краязнаўчыя медыцынскія даследаванні. Роля медыцынскай секцыі Інбелкульта, медыцынскай секцыі краязнаўчага таварыства БДУ у вывучэнні санітарна-гігіенічнага стану асобных населеных пунктаў і рэгіянальнай паталогіі. Уклад З.К. Магілёўчыка ў арганізацыю і правядзенне даследаванняў санітарна-гігіенічнага стану.

Краязнаўчыя даследаванні мастацтва. Працы Ф.П. Ждановіча, М.М. Шчакаціхіна.

## Тэма 13. Краязнаўчая дзейнасць у Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.)

Краязнаўчая праца Беларускага навуковага таварыства, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, студэнцкага Таварыства прыяцеляў беларусаведы. Беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні (1921 – 1945 гг.). Краязнаўчыя матэрыялы ў беларускім перыядычным друку.

Польскія навуковыя цэнтры, якія займаліся вывучэннем беларускіх рэгёнаў: Віленскі універсітэт імя Стэфана Баторыя, Таварыства сяброў навук у Вільні, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей.

Фарміраванне арганізацыйнай структуры ПКТ на заходнебеларускіх землях, асноўныя напрамкі дзейнасці яго рэгіянальных аддзяленняў; дасягненні і недахопы функцыянавання арганізацыі. Стварэнне Палескага музею Пінскім аддзелам ПКТ.

Краязнаўчыя перыядычныя выданні ў заходнебеларускіх ваяводствах і паветах: “Лідская зямля”, “Пінская зямля” і інш. Часопіс “Атэнэум Віленьскі”.

Школьнае краязнаўства, яго сувязь з грамадскім краязнаўчым рухам.

Выдатныя краязнаўцы перыяду: Ю. Ядкоўскі, Ч. Пяткевіч, О. Гедэман, Р. Гарашкевіч, Т. Урублеўскі, Я. Драздовіч, У. Абрамовіч, А. Снежка, М. Шумелевіч і інш.

## Тэма 14. Аднаўленне краязнаўчай дзейнасці ў БССР і яе арганізацыя ў 1945 – 1980-я гг.

Стан краязнаўчай работы пасля вызвалення Беларусі: аднаўленне навуковых рэгёназнаўчых даследаванняў АН БССР, ВНУ і іншых навуковых устаноў. Пашырэнне ў 60 – 80-я гг. рэгёназнаўчых даследаванняў у сістэме інстытутаў АН БССР і іншых навукова-даследчых інстытутах. Увядзенне краязнаўства як навуковай дысцыпліны ў ВНУ, стварэнне краязнаўчых студэнцкіх гурткоў. Гісторыка-краязнаўчы гурток у Гродзенскім педагагічным інстытуце.

Репозиторий БГУКИ

Стварэнне сеткі краязнаўчых музеяў, роля М.Ф. Мельнікава, І.І. Стаброўскага. Арганізацыя гісторыка-археалагічных запаведнікаў (1967 г.), гісторыка-культурных запаведнікаў у Заслаўі, Полацку, Гродне, Нясвіжы.

Школьнае краязнаўства: арганізацыя, формы, кірункі даследаванняў. Рух чырвоных следапытаў. Развіццё сеткі школьных краязнаўчых музеяў і куткоў. Музей А.М. Белакоза (в.Гудзевічы). Краязнаўчая дзейнасць экскурсійна-турыстычных арганізацый (Рэспубліканская турысцкая база, Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя). Удзел школьнікаў у турыстычна-краязнаўчых экспедыцыях.

Краязнаўчая дзейнасць творчых калектываў, клубаў і іншых устаноў і арганізацый. Пачатак краязнаўчай работы дабраахвотных таварыстваў: Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага таварыства аховы прыроды, Беларускага фонду культуры і інш.

Уздым грамадскага краязнаўчага руху ў другой палове 80-х гг. Усебеларуская канферэнцыя краязнаўцаў у 1989 г. і стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства (БКТ); роля А.Г. Каханоўскага. Асноўныя задачы і напрамкі дзейнасці БКТ.

Краязнаўчыя матэрыялы ў перыядычных выданнях, прадаўжальных выданнях: “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, “Родная прырода”, “Роднае слова” і інш. Краязнаўства на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Актывізацыя краязнаўчага кнігавыдання.

## Тэма 15. Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў у БССР у 1945 – 1980-я гг.

Вывучэнне насельніцтва і населеных пунктаў. Комплексныя краязнаўчыя выданні. Гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні і апісанні беларускіх рэгіёнаў. Уклад А.П. і В.П. Грыцкевічаў, Л.У. Дучыц, Э.М. Загарульскага, М.І. Ермаловіча, У.Ф. Ісаенкі, Л.Р. Казлова, Г.А. Каханоўскага, А.І. Мальдзіса, А.М. Падліпскага, У.М. Ліўшыца, В.У. Скалабана, М.А. Ткачова, І.І. Філіповіча, З.В. Шыбекі, Г.В. Штыхава і інш. Вывучэнне М.М. Улашчыкам летапісання і гістарычных крыніц, прысвечаных беларускім рэгіёнам. Станоўчыя і негатыўныя з’явы ў краязнаўчых даследаваннях перыяду.

Дзейнасць Інстытута мовазнаўства АН БССР, ВНУ па вывучэнні дыялектаў і гаворак беларускай мовы. Стварэнне “Дыялектычнага атласа беларускай мовы”, работа па падрыхтоўцы і выданню слоўнікаў гаворак і дыялектаў (“Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча”, “Тураўскі слоўнік”, “Дыялектны слоўнік Брэстчыны” і інш.)

Тапанімічныя даследаванні В.А. Жучкевіча, Я.Н. Рапановіча і іншых вучоных.

Даследаванне фізічнай геаграфіі абласцей і раёнаў, уклад П.А. Лярскага, Н.С. Ратабыльскага, В.А. Дзяменцьева; апісанне турыстычных маршрутаў па абласцях і інш. Прыродазнаўчая інфармацыя аб мясцовасцях у



Репозиторий БГУКИ

энцыклапедыях і даведачных выданнях, прысвечаных абласцям і гарадам (“Брэсцкая вобласць”, “Віцебская вобласць”, “Магілёў”, “Мінск” і інш.).

Даследаванні рэгіянальных асаблівасцей рассялення насельніцтва і яго фізічных тыпаў да аварыі на ЧАЭС.

### Тэма 16. Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі

Пачатак краязнаўчай работы Дзяржаўнай бібліятэкі БССР і іншых бібліятэк. Дзейнасць Бібліяграфічнай камісіі Інбелкульта па стварэнні краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў. Краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы ў часопісе “Наш край”.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк у Заходняй Беларусі. Стварэнне Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну і роля Публічнай бібліятэкі імя С. Баторыя у здзяйсненні бягучага бібліяграфічнага ўліку мясцовых выданняў. Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць Публічнай бібліятэкі імя Я. і Э. Урублеўскіх.

Развіццё краязнаўчай бібліяграфіі, дзейнасць бібліятэк па стварэнні краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў.

Узнаўленне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк у пасляваенны перыяд. Удзел абласных бібліятэк у выпуску краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Стварэнне ў абласных бібліятэках структурных падраздзяленняў па краязнаўстве, фарміраванне краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў: каталогаў (картатэк), выпуск бібліяграфічных дапаможніках розных відаў, тыпаў, жанраў.

Вывучэнне гістарычных, тэарэтычных, арганізацыйна-метадычных пытанняў краязнаўчай бібліяграфіі Л.Р.Амелькові́ч, Р.М.Чыгіровай, В.Е.Лявончыкавым.

## Раздзел VI. РАЗВІЦЦЁ КРАЯЗНАЎСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2010-я гг.)

### Тэма 17. Развіццё грамадскага краязнаўчага руху

Уплыў новых гістарычных і сацыяльна-культурных умоў на павышэнне грамадскай ролі краязнаўства, павелічэнне інтарэсу да яго, удасканаленне метадалогіі краязнаўчых даследаванняў. Значэнне дзяржаўных і рэгіянальных праграм для краязнаўчай работы.

Мэты, задачы і кірункі краязнаўчай дзейнасці Беларускага краязнаўчага таварыства ў афіцыйных дакументах арганізацыі. Роля Г.Каханоўскага ў яго стварэнні і функцыянаванні. Фарміраванне структуры Беларускага краязнаўчага таварыства, стварэнне абласных краязнаўчых аб’яднанняў. Асноўныя кірункі і формы дзейнасці структур Беларускага краязнаўчага таварыства. Прычыны прыпынення функцыянавання цэнтральных і рэгіянальных органаў таварыства. Уплыў арганізацыі на далейшае развіццё краязнаўчага руху ў Беларусі.



Репозиторий БГУКИ

Стварэнне грамадскіх краязнаўчых арганізацый і іх дзейнасць (Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.Сапунова, Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О.М. Гедэмана, Ляхавіцкае таварыства “Тадэвуш Рэйтан”, краязнаўчае таварыства “Мінск” і інш.)

Напрамкі краязнаўчай дзейнасці нацыянальна-культурных таварыстваў (“Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі”, украінскае грамадска-культурнае таварыства “Голас Берасцейшчаны” і інш.)

Роля Беларускага фонду культуры, Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і іншых добраахвотных таварыстваў у развіцці краязнаўчай дзейнасці. “Краязнаўчая газета” Беларускага фонду культуры. Дзейнасць Навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны па краязнаўстве.

### Тэма 18. Развіццё школьнага і дзяржаўнага краязнаўства

Асноўныя кірункі і формы школьнага краязнаўства. Рэспубліканскія турыстычна-краязнаўчыя экспедыцыі “Наш край”. Дзейнасць Рэспубліканскага цэнтру краязнаўства і турызму навучэнскай моладзі і іншых экскурсійна-турыстычных арганізацый па развіцці краязнаўчага руху.

Уклад інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, архіваў, музеяў, іншых даследчых устаноў і ВНУ у навуковае краязнаўства. Заходне-палесскае навуковае краязнаўчае таварыства “Загароддзе” пры НАН Беларусі. Пашырэнне краязнаўчых вучэбных дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў у ВНУ.

Роля навуковых краязнаўчых канферэнцый і краязнаўчых чытанняў. Удзел у іх арганізацыі грамадскіх краязнаўчых арганізацый, навуковых цэнтраў, ВНУ, краязнаўчых музеяў, мясцовых уладаў.

Актывізацыя бібліятэчнага краязнаўства.

Краязнаўчыя матэрыялы ў перыядычных і прадаўжальных выданнях: “Спадчына”, “Беларуская мінуўшчына”, “Беларускі гістарычны часопіс”, “Падарожнік”, “Беларускі гістарычны агляд” і інш. Краязнаўчыя часопісы, альманахі, неперыядычныя зборнікі: “Берасцейскія карані”, “Гарадзенскія запісы”, “Віцебскі сшытак”, “Магілёўская даўніна”, “Магілёўшчына”, “Палессе”, “Лідскі летапісец”, “Куфэрак Віленшчыны” і інш. Краязнаўства на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Актывізацыя выдання краязнаўчай літаратуры. Краязнаўчыя выдавецкія серыі: “Па родным краі”, “Нашы славутыя землякі” (“Полымя”), “З вякоў мінулых” (“Мастацкая літаратура”), “Ведаць свой край Беларусь” (“Пейто”) і інш. Завяршэнне праекта гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”.

Беларускае краязнаўства ў Інтэрнэт.

Репозиторий БГУКИ

## Тэма 19. Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў

Комплексныя апісанні асобных рэгіёнаў у працах А.М. Карлюкевіча, А.А. Марціновіча, А.І. Махнача і інш.

Пашырэнне тэматыкі гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Вывучэнне рэгіянальнай генеалогіі, выпуск актавых зборнікаў, прысвечаных рэгіёнам і інш. Уклад А. Атнагулава, А.М. Міхальчанкі, С.Я. Рассадзіна, С.А. Рыбчонка, М.Ф. Спірыдонава, А.К. Цітова, З. Яцкевіча і інш.

Гісторыка-археалагічныя даследаванні, фальклорна-этнаграфічныя і этналагічныя даследаванні рэгіёнаў Беларусі. Уклад У.Ф.Ісаенкі, В.В.Шведа, І.А. Марзалюка, В.С.Цітова і інш.

Геаграфічныя, прыродазнаўчыя і экалагічныя даследаванні, выпуск даведачных выданняў і вучэбных дапаможнікаў па геаграфіі і прыродзе рэгіёнаў.

Літаратурна-краязнаўчыя даследаванні, уклад А.І. Мальдзіса, Л. Кулажэнка і інш.

Актывізацыя краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк. Роля Роля "Палажэння аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь" у развіцці арганізацыйнай структуры бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў перыяд 1993 – 2010 гг. Укараненне аўтаматызаваных тэхналогій і стварэнне электронных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў: бібліяграфічных, паўнатэкставых і камбініраваных баз даных у абласных і публічных масавых бібліятэках. Прадстаўленне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў на сайтах бібліятэк. Асноўныя тэндэнцыі ў падрыхтоўцы бібліятэкамі сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Даследаванні пытанняў краязнаўчага бібліяграфазнаўства Т.В.Кузьмініч, А.В.Прадзеінай, В.І.Саітавай.

Актывізацыя вывучэння гісторыі беларускага краязнаўства, уклад Л.В. Аляксеева, Я.М. Мяшэчкі, В.У. Скалабана, І.У. Цітовіча, М.В. Півавара і інш.

Репозиторий БГУКИ

# МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ СЕМІНАРАЎ

## Тэматыка семінараў

Семінарскія заняткі з'яўляюцца вынікам самастойнай работы па вывучэнні асноўнай і дадатковай літаратуры па прапанаваных ніжэй тэмах семінарскіх заняткаў. Семінарскія заняткі садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню самых складаных і значных тэм курса.

На семінары студэнты павінны паказаць дастаткова глыбокае веданне матэрыялу тэмы, асноўнай і дадатковай літаратуры, уменні аналізаваць гэты матэрыял, выяўляць галоўныя факты і з’явы развіцця айчыннага краязнаўства, самастойна разважаць і рабіць вывады па вызначанай тэме.

У падрыхтоўку да семінарскага занятку ўваходзіць вывучэнне рэкамендуемай літаратуры, канспектаванне, складанне разгорнутых адказаў па кожным пытанні. Неабходна прачытаць асноўную і дадатковую літаратуру, зрабіць выпіскі і падрыхтаваць кароткі або разгорнуты (па жаданні студэнта) пісьмовы адказ на кожнае пытанне семінара. Важна падабраць цытаты з рэкамендаваных крыніц, якія ярка паказваюць сутнасць разглядаемых з’яў.

Па жаданні студэнты могуць падрыхтаваць і заданні, прапанаваныя ў межах НДР, для гэтага выкладчык дае дадатковую кансультацыю.

Існуюць наступныя патрабаванні да выступлення студэнта: добрае валоданне вывучаным матэрыялам; уменне звязаць яго з адпаведным напрамкам дзейнасці бібліятэк; лагічнасць і паслядоўнасць у адказе; выдзяленне найбольш важных палажэнняў і ўменне зрабіць вывады па кожным пытанні семінара. Дадатковыя балы набіраюць студэнты, якія дапаўняюць выступленні, выказваюць крытычныя і ацэначныя меркаванні, вядуць дыскусію, рыхтуюць невялікія прэзентацыі па тэматыцы семінараў.

Репозиторий БГУКИ

**СЕМІНАР № 1**
**па тэме “КРАЯЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ВКЛ (XVI ст.– 1794 г.), 2 гадзіны**

**Пытанні**

1. Як гісторыка-культурныя ўмовы на беларускіх землях спрыялі ўзнікненню краязнаўчай дзейнасці?
2. Хронікі і летапісы як праяўленне пачатку аматарскага і навуковага краязнаўства.
3. Характарыстыка рэгіянальных летапісаў і хронік XVI – XVII стст.
4. Як апісвалі беларускія землі М.Стрыйкоўскі, А.Гваньіні, Я.Ласіцкі?
5. Уклад І.Сцябельскага, А.Нарушэвіча, аўтараў гербоўнікаў у гісторыка-рэгіянальныя апісанні і даследаванні.
6. Адлюстраванне геаграфічных аб’ектаў і населеных пунктаў на картах. Значэнне картаграфічнай дзейнасці Т.Макоўскага.
7. Узнікненне і як развіццё прыродазнаўчых рэгіянальных даследаванняў. Ахарактарызуйце дзейнасць Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. Алексеев, Л.В. Археалогия и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мінск : Бел. навука, 1996. – 206 с.
2. Баркалабаўскі летапіс / [рэдакцыйны савет: А. А. Тозік [і інш.]. - Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2013. – [352] с.
3. Жылібер Ж.Э. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – С.380.
4. Игнатович, Ф.И. Ж.Э. Жилибер и Гродненская медицинская академия (к 270-летию со дня рождения) / Ф.И. Игнатович // Журнал Гродненского государственного медицинского университета. – 2011 – №2 (34) – С. 85-90
5. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А.Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – С. 7-22.
6. Лецка, Я. Р. Падзеі і жарсці дзён мінулых. "Хроніка еўрапейскай Сарматыі" Аляксандра Гваньні / Я.Р. Лецка // Роднае слова. – 2008. – № 8.- С.9-11.
7. Савук, А. Паслядоўнік Лінэя Станіслаў Юндзіл [Электронны рэсурс] / А.Савук. – Рэжым доступа: http://www.istpravda.ru/bel/digest/2836/
8. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.27 – 48.


Репозиторий БГУКИ

9. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

*Дадатковая*

1. Вінчэўскі, Дз.Я. Станіслаў Баніфацы Юндзіл (1761–1847) – асноўныя факты жыцця і навуковай дзейнасці [Электронны рэсурс] / Дз. Я. Вінчэўскі // Зоологические чтения : Материалы Республиканской научно-практической конференции, посвященной 250-летию со дня рождения профессора С.Б. Юндзилла (1761–1847). – Рэжым доступа: http://www.lib.grsu.by/library/data/resources/catalog/165219-367974.pdf2012. - С.3 – 6.
2. Игнатович, Ф. Как поссорились Тизенгауз и Жилибер / Ф.Ігнатович // Падарожнік. – 2001. – № 1. – С.32 – 34.
3. Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI – 1944 г.: даведнік / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 176 с.: фат.
4. Шаруха, І.М. Крыніцы прыродазнаўча-геаграфічных ведаў на Беларусі са старажытнасці да 1795 года / І.М.Шаруха // Магілёўс. даўніна. – Магілёў, 1997. – С.113 – 121.

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 2
## па тэме “КРАЯЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1795 – 1917 гг.), 4 гадзіны

### Пытанні

1. Ахарактарызуйце развіццё арганізацыйнай структуры і асноўных відаў краязнаўчай дзейнасці.
2. Раскрыйце ролю Віленскага ўніверсітэта, Полацкай езуіцкай акадэміі і Горы-Горацкай земляробчай школы ў краязнаўчых даследаваннях.
3. Развіццё грамадскага краязнаўчага руху:
   - 3.1 у чым значэнне даследчай краязнаўчай дзейнасці беларускіх супрацоўнікаў кола М.П.Румянцава?
   - 3.2 прачытайце главу манаграфіі Л.Аляксеева), прысвечаную Віленскаму музею старажытнасцей і Віленскай археалагічнай камісіі і адкажыце на пытанні:
     - 3.2.1.якая роля Яўстаха Тышкевіча ў стварэнні музея і археалагічнай камісіі?
     - 3.2.2. з якіх мясцовых калекцый складаліся зборы музея?
     - 3.2.3. якія кірункі і формы дзейнасці археалагічнай камісіі?
     - 3.2.4. чаму Віленскі музей старажытнасцей і археалагічная камісія праследаваліся ўладамі?

4. Прааналізуйце кірункі даследаванняў выдатных краязнаўцаў: З.Даленгі-Хадакоўскага, Т.Нарбута, графоў Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў, А.Г.Кіркора, А.П.Сапунова, Е.Р.Раманава.

5. Збіральніцкая дзейнасць І.Храптовіча, К.Тызенгаўза, А.Ельскага, Э.Гутэн-Чапскага.

5.1. Як ацаніў вядомы сучасны краязнавец А.Валахановіч каштоўнасць калекцый Э.Гутэн-Чапскага?

6. Кірункі краязнаўчай дзейнасці дзяржаўных адміністрацыйных і навуковых установ:

6.1. губернскіх статыстычных камітэтаў

6.2.цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг у Вільні і Віцебску.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. Алексеев, Л.В. Братья Тышкевичи // Археалогия и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Минск: Бел. навука, 1996. – С.57 – 65.
2. Валахановіч, А.І. Графы фон Гутэн Чапскія на Беларусі / А.І.Валахановіч. – Мн.: БелНДІДАС, 2003. – 84 с.
3. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А.А.Гужалоўскі. – Мн., 2001. – С.21 – 23, 27 – 30.

Репозиторий БГУКИ

4. Дуко, А.А. Навукова-даследчыцкая і літаратурная дзейнасць Аляксандра Ельскага / А.А. Дуко // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 6. – С.49 – 53.
5. Запартыка, Г.В. І.І.Грыгаровіч / Г.В.Запартыка, А.М.Запартыка // Бел. археаграф. штогоднік. 2001. Вып.2. – Мн., 2001. – С. 260 – 267.
6. Зямчонак, Я. Бароны Тызенгаўзы ў гісторыі Пастаў / Я. Зямчонак // Спадчына. – 1997. – № 5. – С.127 – 147.
7. Каханоўскі, Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 119 с.
8. Каханоўскі, Г.А. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, Каханоўскі А.Г. – Мн.: Полымя, 1992. – 63 с.
9. Кушнер, В.Ф. Збіральнік народных скарбаў [А.Ельскі] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 6. – С. – 41 – 48..
10. Н.П.Румянцев на белорусской земле: материалы Междунар. круглого стола (Гомель, 26-27 дек. 1996) – Мн., 1997. – 67 с.
11. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.49 – 101.
12. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

*Дадатковая*

1. Валасных, Я. Навучальная ўстанова еўрапейскага кшталту /Я.Валасных // Бел. мінуўшчына. – 1997. – № 5. – С.72 – 74.
2. Марціновіч, А.А. Ліхтар на шляху беларускасці : П.Шпілеўскі/ А. Марціновіч // Элегіі забытых дарог : [гіст. нарысы, эсэ]. – Мінск, 2001. – С.220 – 244.
3. Марціновіч, А.А. Ля агню даўніны: Яўстафій Тышкевіч / А. Марціновіч // Хто мы, адкуль мы … : гіст. эсэ, нарысы 6 у 2 кн. – Мінск, 1996. Кн. 1. – С.407 – 422.
4. Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI – 1944 г.: даведнік / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 176 с.: фат.
5. Федарук, Н.А. Асаблівасці выкладання геаграфіі ў сярэдніх навучальных установах Віленскай навучальнай акругі (1803 – 1903) / Н.А.Федарук // Вес. Бел. дзярж. пед. ун-та імя М.Танка. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2004. – № 1. – С.39 – 42.

Репозиторий БГУКИ

*Заданне для НДРС:*

Падрыхтуйце паведамленне аб краязнаўчых даследаваннях Е.Р.Раманава на Магілёўшчыне і Віцебшчыне. Выкарыстайце сучасныя ацэнкі навуковага ўкладу краязнаўцы.

1. Е.Р.Раманаў. З гісторыка-археалагічнай спадчыны: выбраныя творы / Е.Р.Раманаў; пад навук. рэд. І.А.Марзалюка. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – 240 с.

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 3

## па тэме “КРАЯЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС” (1918 – чэрвень 1941 г.).

**4 гадзіны**

**Пытанні**

1. Якія гістарычныя фактары спрыялі пад’ёму краязнаўства ў БССР?
2. Фарміраванне арганізацыйнай структура краязнаўства.
3. Роля Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК) у арганізацыі краязнаўчага руху. Якія тыпы краязнаўчых арганізацый утваралі грамадскі краязнаўчы рух?
4. Роля краязнаўчых з’ездаў і канферэнцый у вызначэнні задач і кірункаў краязнаўчай дзейнасці.
5. Значэнне часопіса “Наш край” і рэгіянальных краязнаўчых выданняў (“Віцебшчына”, “Магілёўшчына”, “Асіповіцкі раён”, “Горацкі раён”).
6. Краязнаўчая дзейнасць навуковых устаноў, архіваў, музеяў, ВНУ і ССНУ.
   - 6.1. На падставе артыкула М.Шумейкі пакажыце розніцу паміж тагачаснымі і сучаснамі ўяўленнямі аб узаемадзеянні архіваў і краязнаўчых арганізацый.
   - 6.2. На падставе артыкула М. Улашчыка “Краязнаўчае таварыства БДУ” раскрыйце праблемы стварэння краязнаўчай арганізацыі ва ўмовах таго часу.
7. Прачытайце артыкул А.У.Дзянісава *(№ 3 спіса)*. Якімі прычынамі аўтар тлумачыць развал беларускага краязнаўства?
8. Формы краязнаўства ў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.
9. Якую работу праводзілі заходнебеларускія аддзяленні Польскага краязнаўчага таварыства?
10. Ахарактарызуйце краязнаўчыя зборы ў Беларускім гісторыка-этнаграфічным музеі імя Івана Луцкевіча ў Вільні, Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі і Палескім музеі.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 206 с.

Репозиторий БГУКИ

2. Амелькович, Л.Г. Деятельность Центрального бюро краеведения Белоруссии (1923–1933) / Л.Г.Амелькович // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Мн., 1975. – С.59–77.
3. Дзянісаў, А.У. Развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 1920 – 1930-я гг. / А.У.Дзянісаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 4. – С.24 – 32.
4. Краязнаўчы рух // Памяць. Мінск: гіст.-дакум. хроніка. Кн. 3. – Мн.: БЕЛТА, 2004. – С. 205–208.
5. Кузьмич, А.С. Краеведческое движение в Гомеле в 20-е годы XX в. / А.С.Кузьмич, А.В.Кузьмич // Краеведческие записки: к 80-летию Гомел. обл. краевед. музея. – Гомель, 2000. – С.196 – 203.
6. Лісаў, А. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А.Лісаў, А.Падліпскі / Віцеб. краязн. фонд імя А.Сапунова. – Віцебск, 2000. – 48 с.
7. Мартынава, Н.В. Беларускі дзяржаўны музей і Інстытут беларускай культуры: супрацоўніцтва ў галіне этнаграфічных даследаванняў, развіцці краязнаўчага руху і станаўленні музейнай справы на Беларусі ў 1920-х – пачатку 1930-х гг./ Н.В.Мартынава // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мн., 2008. – Вып. 4. – С.5 – 13.
8. Прадзеіна, А.В. Абуджаць гістарычную рамантыку / А.В.Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С.30 – 32.
9. Разуванава, К.С. Дзейнасць Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры на тэрыторыі Палескага ваяводства (1926 – 1931 гг.) / К.С.Разуванава // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя 2, Гісторыя, эканоміка, права. – 2010. – № 1. – С.73–78.
10. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.27 – 48.
11. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
12. Улашчык, М. Краязнаўчае таварыства БДУ / М.Улашчык // Краязнаўства. – Мн.: Пейто, 1999. – С.9–40.
13. Цітовіч, І.У. Заканадаўчыя аспекты краязнаўчага руху Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) / І.У.Цітовіч // Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 1. – С.3. – 10.
14. Шорац, Л.Ф. Школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 20 – 30-я гады XX ст. / Л.Ф.Шорац // Веснік віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2005. – № 4. – С.36 – 39.
15. Шумейко, М. Белорусские архивы и краеведение в 1920-е годы / М.Шумейко // Архивы и справаводства. – 2003. – № 4. – С.87 – 95.

Репозиторий БГУКИ

*Дадатковая*

1. Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А.А.Гужалоўскі. – Мн., 2001. – С.73 – 76.
2. Дзянісаў, А.У. Краязнаўчы рух у БССР у 30-я гг. ХХ ст. / А.У. Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С.194 – 197.
3. Дзянісаў, А.У. Напрамкі дзейнасці нацыянальных аддзелаў пры Цэнтральным бюро краязнаўства ў БССР у сярэдзіне 1920-х гг. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Серия, 5, История, философия, филология. – 2010. – Вып. 18. – С.66 – 68.
4. Дзянісаў, А.У. Палітыка ўладаў у дачыненні да добраахвотных краязнаўчых арганізацый Беларусі ў 1920 – 1923 гг. / А.У. Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С.190 – 193.
5. Прадзеіна, А.В. Абуджаць гістарычную рамантыку / А.В.Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 30–32.
6. Цітовіч, І.У. Аматарскае краязнаўства 1921 – 1939 гг. і яго месца ў нацыянальна-культурным жыцці заходнебеларускага насельніцтва / І.У.Цітовіч // Философия. Культура. Общество: сб. тр. молодых ученых и аспирантов / РИВШ. – Мн., 2004. – Вып. 4. в 2 ч., ч.1. – С.155 – 163.
7. Малаш, Ю. Язэп Драздовіч – вандроўнік, мастак, гісторык // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 78-82.

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 4

## па тэме **“КРАЯЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД” (1945 – 1980-я гг.), 2 гадзіны**

Пытанні

1. Развіццё формаў краязнаўства ў пасляваенны перыяд.
2. Аднаўленне і пашырэнне сеткі краязнаўчых музеяў, кірункі іх дзейнасці.
2. Развіццё школьнага краязнаўства. Значэнне руху чырвоных следапытаў.
3. Напрамкі і формы дзейнасці рэспубліканкіх дабраахвотных таварыстваў: ахопы помнікаў гісторыі і культуры, аховы прыроды, Фонда культуры і інш.
4. Стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства. Ахарактарызуйце яго структуру, галоўныя задачы і ролю старшыні Г.А.Каханоўскага.
4. Краязнаўчая дзейнасць навуковых устаноў.
5. Актывізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. Мешечко, Е.Н. Географическое краеведение: учеб. пособие. – Мн.: УП «Экоперспектива», 2002. – С.28 – 33.
2. Каханоўскі Генадзь Аляксандравіч: навуковец і пісьменнік [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://mregion.iatp.by/kahanouski.htm.
3. Несцярчук, Л. Гісторыя дзейнасці грамадскіх арганізацый Беларусі па ахове помнікаў // Каштоўнасці мінуўшчыны 8. — Мінск, 2005. – С.16-22.
4. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / М.В.Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – №. 3. – С.46 – 52.
5. Развитие исторического краеведения // Историческое краеведение Белоруссии: учеб пособие. – Мн., 1980. – С.5 – 44.
6. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.153 – 173.
7. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
8. Чыгрын, С.М. Родам са Слонімшчыны : Літ.-краязн. партр. [Аб І.І. Стаброўскім] / С.М. Чыгрын. – Слонім ; Мінск, 2003. - 65 с.


*Дадатковая*


1. Саламевіч, Я. Руплівец: [аб Г.А.Каханоўскім] / Я.Саламевіч // ЛіМ. – 1996. – 19 студз. (№3). – С.12.


Рэпазіторый БГУКІ

## СЕМІНАР № 5
## па тэме “КРАЯЗНАЎСТВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ” (1991 – 2010-я гг.), 2 гадзіны
## Пытанні

1. Якую падтрымку краязнаўчаму руху аказваюць органы дзяржаўнай улады і кіравання?
2. Тэндэнцыі развіцця грамадскага краязнаўчага руху.
3. Ахарактарызуйце спробы аднаўлення Беларускага краязнаўчага таварыства.

   3.1. Прачытайце Статут БКТ і ахарактарызуйце галоўныя задачы краязнаўчых даследаванняў.

   3.2. Патлумачце, чаму ідэя стварэння галоўнага цэнтра краязнаўчага руху ў краіне на думку некаторых краязнаўцаў страціла сваю актуальнасць.
4. Кірункі і формы школьнага краязнаўчага руху.
5. Кірункі і формы краязнаўства ў ВНУ.
6. Дзейнасць па краязнаўстве архіваў і Археаграфічнай камісіі Белкамархіва.
7. Дасягненні ў развіцці сістэмы краязнаўчых музеяў.
8. Раскрыйце дасягненні краязнаўчага друку, у т.л. стварэнне “Краязнаўчай газеты”. Стварэнне краязнаўчых сайтаў.
9. Міхась Казлоўскі, краязнавец, рэдактар альманаха «Куфэрак Віленшчыны»:

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*


1. Катовіч, Н.К. Организация и руководство краеведческой деятельностью школьников / Н.К. Катович // Пазашкольнае выхаванне. 2003. – № 8. – С.13 – 15.
2. Кравец, А. Экспедыцыя навучэнцаў “Наш край” / А. Кравец // Беларускі гістарычныы часопіс. – 2006. – № 6. – С.61 – 64.
3. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.174 – 198.
4. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
5. Саітава, В.І. Публікацыі грамадскіх краязнаўчых арганізацый як прадстаўленне рэгіянальнай адметнасці ва ўмовах глабалізацыі культуры / В.І.Саітава // Бібліятэчны веснік : зборнік артыкулаў. Вып. 1 /


Репозиторий БГУКИ

Нацыянальная бібліятэка Беларусі : складальнік М.Г.Алейнік. – Мн. : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2010. – С.71–77.
6. Статут Беларускага краязнаўчага таварыства // Бел. мінуўшчына. – 1996. – № 5. – С.75–76.
7. Півавар, М.В. Музеі Віцебска на пачатку ХХІ ст. : манаграфія / М.В. Півавар. – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – 179 с.
8. Шарухо, И.Н. Агрогородки и агроусадьбы как объекты краеведческих исследований / И.Н. Шарухо, У.С. Демьянёнок // Проблеми безперервної географічної освіти і картографії. – 2012. – Вип. 16. – С. 127-130. – Режим доступу: http://nbuv.gov.ua/j-pdf/Pbgo_2012_16_39.pdf.
9. Шацкая, А.Н. Государственная политика поддержки краеведческого движения в Республике Беларусь – 1991 – 2003 гг. / А.Н.Шацкая // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: сб. материалов респ. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рождения Ф.В.Зеньковича, 16 – 17 окт. 2003. – Брест, 2003. – С.21 – 25.
10. Шумейко, М. К 70-летию образования областных государственных архивов / М.Шумейко // Архівы і справаводства. – 2008. – № 3. – С.138 – 140.

*Дадатковая*

1. Карлюкевіч, А. Ад зямлі, што нарадзіла і натхняла: пра развіццё літ.-краязн. справы на Пухаўшчыне / А.Карлюкевіч // Род. слова – 2002. – № 11. – С.104 – 107.
2. Краеведы возобновили работу // Гомел. праўда. – 2003. – 2 кастр. – С.1.
3. Лабовіч, Антон. Мудры настаўнік Алесь Белакоз / Антон Лабовіч. – Гродна, 2006. – 71 с.
4. Ліс, А. Памяці Генадзя Каханоўскага / А.Ліс // Спадчына. – 1994. – № 1. – С.143 – 144.
5. Мальдзіс, А. Скарынаўскі цэнтр і краязнаўства / А.Мальдзіс // Падарожнік. – 1997. – №1. (укладка паміж С.10–11).
6. 
7. Pawet http: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: // pawet.narod.ru/page1.html/
8. Сайт Радунскай гімназіі – экскурсіі музея http://radgymn.by/viewpage.php?page_id=8

Репозиторий БГУКИ

## СЕМІНАР № 6
## па тэме "КІРУНКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ" (1991 – 2010-я гг.), 4 гадзіны

### Пытанні

1. Задачы і асноўныя напрамкі гісторыка-краязнаўчых даследаванняў.
2. Дасягненні краязнаўцаў па кірунку гісторыка-археалагічных даследаванняў.
3. Вынікі гісторыка-краязнаўчага вывучэння асобных рэгіёнаў Беларусі (рэфераты і электронныя прэзентацыі, падрыхтаваныя студэнтамі).
4. Задачы і асноўныя напрамкі этнаграфічных даследаванняў.
5. Вынікі этнаграфічнага вывучэння асобных рэгіёнаў Беларусі (рэфераты і электронныя прэзентацыі, падрыхтаваныя студэнтамі).
6. Задачы і асноўныя напрамкі вывучэння насельніцтва рэгіёнаў Беларусі.
7. Вынікі этналагічнага вывучэння асобных рэгіёнаў Беларусі (рэфераты і электронныя прэзентацыі, падрыхтаваныя студэнтамі).
8. Дасягненні ў развіцці краязнаўчай бібліяграфіі.

*ЛІТАРАТУРА*
*Асноўная*


1. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.174 – 198.
2. Археалогія Беларусі: У 4 т. / Мінск, 1997 – 2001. (чытальная зала БДУКМ).
3. Берасцейскі вазок : зборнік матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый і II дзіцячай абласной навукова-практычнай канферэнцыі. – Брэст : Альтернатива, 2009. – 157 с.
4. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X-XIII стст.: (Паводле археал.звестак). – 2-е выд. / Л.У. Дучыц. – Мінск : Бел.навука, 2001. – 78 с.
5. Канапацкі, І.Б. Гісторыя і культура беларускіх татар: [Вучэб. дапам.] / І.Б.Канапацкі, А.І. Смолік. – Мінск, 2000. – 258 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. —Мінск, 2001 – 2011. (чытальная зала БДУКМ).
7. Улейчик, Н. Л. Возрождение и развитие народного творчества в Гродненском регионе в конце XX — начале XXI вв. / Улейчик Н. Л., Змитрович И. О. // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях : материалы Международной


Репозиторий БГУКИ

научной конференции (7-8 июня 2012 года, г. Минск). – Минск : Право и экономика, 2012. — С. 121—125.
8. Цітоў, В. С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 297 с. : іл.

*Дадатковая*

1. 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 30—31 кастрычніка 2008 г. / Мінск : Медысонт, 2009. – 423 с.
2. Гостев, А.П. Кронон: Летопись города на Немане (1116-1990) / А.П.Гостев, В.В. Швед. – Гродно, 1993. – 329 с.
3. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А.Заяц. – Минск : Навука і тэхніка, 1995. – 206 с.
4. Ісаенка, У. Ф. Юравічы над Прыпяццю: Ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя / У.Ф. Ісаенка. – Мінск : АРТЫ-ФЭКС, 2000. 64 с.
5. Романовские чтения - 3: сб. тр. междунар. науч. конф., 23-24 нояб. 2006 г., г. Могилев. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2007. – 174 с.
6. Старажытнасці Бабруйшчыны / склад. Ільюцік А.У., Язэпенка І.М. Аддз. культуры Бабруйскага гарвыканкама, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Бабруйскі краязнаўчы музей. Вып.2. – Мінск, Бабруйск, 1998. - 115 с.
7. Ушаччына сінявокая : спец. пазнав. курс па краязнаўстве / Л. М. Цяцерка [і інш.] – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 134 с.

Репозиторий БГУКИ

# МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 1
## па тэме “РЭГІЯНАЛЬНАЯ СТРУКТУРА БЕЛАРУСІ ПА РОЗНЫХ ПРЫМЕТАХ”, 6 гадзін

**Мэта:** вывучыць гісторыю адміністрацыйна-тэрытарыяльнага раяніравання, падрыхтаваць электронную прэзентацыю.

Заданні: 1) кожны студэнт выбірае адзінку сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, напрыклад, раён, горад і інш. фіксуе важнейшыя сучасныя характарыстыкі гэтага аб’екта: плошчу, колькасць насельніцтва, прыродныя ўмовы і інш.

2) выяўляе крыніцы, па якіх магчыма атрымаць звесткі па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу данай тэрыторыі ў мінулым (у асобныя гістарычныя перыяды). Для гэтага выкарыстоўваюцца:

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. афарм. Э.Э. Жакевіча, А.М. Хількевіча. – Мінск : БелЭн, – 1996-2004.
2. Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2007.
3. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя ў 15 тамах. - Мінск : БелЭн, 2004 –
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: Пашкоў Г.П. (гал. рэд.) і інш.; маст. Жакевіч Э.Э. – Мінск : БелЭн, 1996 – 2003.

3) Стварае электронную прэзентацыю, якая адлюстроўвае змяненні ўваходжання данай (сучаснай) тэрыторыі ў адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, існаваўшыя ў мінулым (паведы, ваяводствы, губерніі і інш.) Сабраныя звесткі фарміруюцца ў сціслы, але лагічна звязаны тэкст. Матэрыял магчыма падаць наступным чынам: спачатку звесткі аб сучасным стане тэрыторыі, затым па гістарычным перыядам, пачынаючы з вытокаў адміністрацыйнага падзелу тэрыторыі (ВКЛ). Першыя слайды аб сучасным становішчы не паўтараюцца.

Студэнты шукаюць звесткі па іншых даведачных, навуковых і папулярных выданнях, па рэсурсах Інтэрнет (у т.л. афіцыйных сайтах раённых выканаўчых камітэтаў і іншых органаў мясцовай улады, дзе ёсць раздзелы “рэгіён”).

Па выяўленых рэсурсах студэнты выбіраюць звесткі:

Репозиторий БГУКИ

1. адміністрацыйна-тэрытарыяльны статус тэрыторыі ў пэўны перыяд (павет, ваяводства, раён і г.д.);
2. адміністрацыйная функцыя аб’екта (цэнтр павета, губерні і інш.);
3. асноўныя сацыяльна-культурныя, эканамічныя і іншыя характарыстыкі ў пэўны перыяд; звесткі аб буйнейшых ваенных падзеях, стыхійных бедствах і інш., якія маглі істотна змяніць гісторыю развіцця тэрыторыі і іншыя важнейшыя звесткі;
4. збіраецца ілюстрацыйны матэрыял, у т.л. карты тэрыторыі розных гістарычных перыядаў, гербы і інш.;
5. складаецца бібліяграфічны спіс выкарыстаных крыніц.
6. Рэфлексія. Абавязкова да выніковага трэцяга занятку студэнты выказваюць і свае думкі аб гістарычных прычынах і наступствах змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, неабходнасці яго ведання і выкарыстання ў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Адзначаюць асабістыя цяжкасці ў выкананні задання і інш.

Першыя дзве гадзіны праводзяцца ў камп’ютарным класе, другі занятак – у бібліятэцы, таксама ідзе самастойная праца – 6 гадзін, трэці – выступленні студэнтаў з прэзентацыямі, падвядзенне вынікаў, рэфлексія.

Ацэнка – залік (дыферэнцыраваны).

Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 2
## па тэме “ЛЕПШЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ ТВОРЫ 1795 – 1917 гг.”, 8 гадзін

*Мэта*: азнаямленне з навуковай і літаратурнай дзейнасцю відных краязнаўцаў перыяду.

*Заданне*: падрыхтаваць бібліяграфічную закладку, прысвечаную адной краязнаўчай кнізе.

*Выкананне:* па жаданні студэнты выбіраюць адну з краязнаўчых кніг, напісаных аўтарамі XIX – XX стст., якая ўважліва чытаецца. Студэнты павінны па бібліяграфічных і фактаграфічных крыніцах сабраць звесткі:

1) аб аўтары-краязнаўцы,
2) асобным творы,
3) яго змесце,
4) часе і рэгіёне (населеным пункце),
5) падзеях і асобах, адлюстраваных у кнізе,
6) выяўляюцца публікацыі, прысвечаныя выбранаму твору і яго аўтару.

На падставе гэтых матэрыялаў складаюцца рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі – бібліяграфічныя закладкі. Пры напісанні фактаграфічнай даведкі (уступа) неабходна прывесці біяграфічныя даныя аб аўтары, паказаць цікавасць зместу, унікальнасць звестак кнігі, але таксама спіс кніг, звязаных па зместу з даным краем. Для напісання тэкста выкарыстоўваецца папулярны стыль.

Чатыры гадзіны студэнты працуюць у бібліятэцы, дзве – камп’ютарным класе, дзве – абмеркаванне матэрыялаў і рэфлексія. Ацэнка – залік. Лепшыя закладкі перадаюцца ў Мінскую абласную бібліятэку імя А.С.Пушкіна.

Рэкамендуюцца творы:

1. Дембовецкий, А. Опыт описания Могилевской губернии : В 3-х кн. – Репринтное изд. – Могилев : АмелияПринт, 2007 – 2008.
2. Довгялло, Д. Лепель: уездный город Витебской губернии /Д. Довгялло.. – Витебск, 1905. – 105 с. (также электронный ресурс в НББ).
3. Живописная Россия : Отечество наше в его земел., историч., племен., экон. и быт. значении: Литов. Белорус. Полесье / под об. ред. П.П. Семенова. – Минск : Бел. Энцыкл., 1994. – 490 с. (таксама выданні іншых гадоў).
4. Никифоровский, Н. Я. Нечистики : свод простонародных в Витеб. Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. — Витебск :

Репозиторий БГУКИ

Изд. Н. А. Паньков, 1995. — 85 с. — (Серия «Народная культура»; вып. 1.).
5. Никифоровский, Н. Я. Странички из недавней старины города Витебска : воспоминания старожила / Н. Я. Никифоровский; предисл., текстол. подгот. и коммент. А. М. Подлипского. — Минск : Полымя, 1995. — 149 с. — (Литературные памятники Беларуси). (также электронный ресурс в НББ).
6. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности (Этнографические данные) Витебск : Губернская типография, 1895. – 674 с.
7. Романов, Е.Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии / издание Управления Виленского учебного округа ; под редакцией Е. Р. Романова. – Вильна : Типография "Русский почин", 1911. – Вып. 1. – 237 с. (39(476), Прэзідэнцкая бібліятэка).
8. Сапунов, А. П. Исторический очерк Витебской Белоруссии / А.П.Сапунов. – Витебск : Типолитография насл. М.Б. Неймана, 1911. – 66 с. (также электронный ресурс в НББ).
9. Сапунов, А.П. Полоцк, Витебск и Минск в 20-х годах прошлого века / А.П. Сапунов. – Витебск : Губернская типолитография, 1901. – 28 с.
10. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2004. – 251 с. і іншыя крыніцы.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – 202 с.
2. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 3
## па тэме “КІРУНКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1918 – чэрвень 1941 гг.)”, 10 гадзін

*Мэта:* Вывучыць рашэнні краязнаўчых з’ездаў і канферэнцый, праведзеных у БССР, іх уплыў на развіццё арганізацыйных формаў краязнаўства і кірункаў краязнаўчых даследаванняў.

*Заданне:* падрыхтаваць пісьмовыя працы.

*Выкананне:* Студэнты падзяляюцца на мікрагрупы па 2-3 чалавекі і знаёмяцца з матэрыяламі аднаго з краязнаўчых з’ездаў ці краязнаўчых канферэнцый. Гэтыя выданні замаўляюцца ў НББ. Неабходна падрыхтаваць пісьмовыя паведамленні, у якіх павінны быць адлюстраваны:

1. Дата правядзення з’езда або канферэнцыі.
2. Агульныя звесткі аб удзельніках (краязнаўчых арганізацый і іншых суб’ектаў). Выявіць найбольш актыўных удзельнікаў з’езду/ канферэнцыі.
3. Пералік праведзеных секцый.
4. Галоўныя даклады. Кожны студэнт знаёміцца па жаданні з адным дакладам і пераказвае яго асноўныя палажэнні. Даецца аналітычнае бібліяграфічнае апісанне даклада.
5. Прааналізаваць прынятыя рашэнні (рэзалюцыі), іх уплыў на развіццё краязнаўчага руху ў БССР.
6. Пазнаёміцца з публікацыямі праграм ці інструкцый краязнаўчых даследаванняў, якія распрацоўваліся ў міжваенны час. Выданне выбіраецца па жаданні студэнта. Выданні і публікацыі замаўляюцца ў НББ.

*Пералік выданняў:*


1. Зборнік праграм і інструкцый па краязнаўству / Бел. Акад. навук, Цэнтр. бюро краязнаўства. — Вып. 1. – 142 с.
2. Краязнаўства / Цэнтр. бюро краязнаўства. — Вып. 1: зборнік праграм і інструкцый краязнаўчай працы. – 113 с.
3. Кулакоў, Т. Як арганізаваць краязнаўчую ячэйку ў калгасе. - Мн. : Друк. Бел. акад. навук, [1932?].
4. Самцэвіч, В. Як арганізаваць краязнаўчую працу на фабрыцы і заводзе / Бел. акад. навук, Цэнтр. бюро краязнаўства. – іМн., 1931. 17 с.
5. Магчыма самастойна выбраць любую краязнаўчую праграму апублікаваную ў часопісе “Наш край” (1925 – 1930).


Репозиторий БГУКИ

Пазнаёміўшыся са зборнікамі, студэнты ўказваюць назвы 1-3 праграм, вызначаюць іх мэты, аб’екты даследавання, метады даследавання і збору матэрыялаў і іншыя кампаненты зместу праграмы.

*ЛІТАРАТУРА*

**Асноўная**


1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. Амелькович Л.Г. Деятельность Центрального Бюро краеведения Белоруссии (1923-1933) / Л.Г.Амельковіч // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. - Мн., 1975. – С. 59 – 77.
3. Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі (1918 – 1941 гг.) / А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 164 с.
4. Лісаў, А. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А.Лісаў, А.Падліпскі / Віцеб. краязн. фонд імя А.Сапунова. – Віцебск, 2000. – 48 с.
5. Мешечко, Е.Н. Географическое краеведение: учеб. пособие. – Мн.: 2002. – С. 3-34. Улашчык, М. Краязнаўчае таварыства БДУ / М.Улашчык // Краязнаўства. – Мн.: Пейто, 1999. – С.9–40.
6. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.102 – 131.
7. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
8. Шумейко, М. Белорусские архивы и краеведение в 1920-е годы / М.Шумейко // Архивы и справаводства. – 2003. – № 4. – С.87 – 95.


**Дадатковая**


1. Кузьмич, А.С. Краеведческое движение в Гомеле в 20-е годы XX в. / А.С.Кузьмич, А.В.Кузьмич // Краеведческие записки: к 80-летию Гомел. обл. краевед. музея. – Гомель, 2000. – С.196 – 203.


Репозиторий БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА № 4
## па тэме “КРАЯЗНАЎЧЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ”, 10 гадзін

*Мэта*: садзейнічанне выпрацоўцы навыкаў абагульнення і аналізу вынікаў краязнаўчага руху, адлюстраваных у фіксаваных крыніцах інфармацыі, а тачсама якаснай ацэнкі краязнаўчых выданняў і папулярызацыі іх сродкамі рэкамендацыйнай бібліяграфіі.

*Заданні*: 1) Краязнаўчая экскурсія. Па дамоўленасці са студэнтамі праводзіцца ў адзін з краязнаўчых музеяў ці па памятных гісторычных мясцінах. Магчыма тэматычная экскурсія: канфесіянальныя помнікі Мінска, забытыя будынкі Мінска, былыя сядзібы на тэрыторыі Мінска і інш. Пасля вызначэння аб’екта ці выбара тэмы, размяркоўваюцца заданні, выяўляюцца і вывучаюцца крыніцы, стараюцца паведамленні. У музеях экскурсію вядуць экскурсаводы.

2) Падрыхтаваць рэферат (электронную прэзентацыю) па актуальнай для сучаснага краязнаўчага руху тэме. Тэма ўзгадняецца выкладчыкам і кожным студэнтам, тэмы могуць аднаўляцца і вар’іравацца з улікам пажаданняў студэнтаў. Форму прадстаўлення матэрыялу таксама выбірае студэнт. Ва ўмовах бібліятэкі (НББ, ЦНБ НАН, Мінскай АБ імя А.С.Пушкіна, БДУКМ) вядзецца пошук крыніц па тэме, вывучаюцца выяўленыя матэрыялы, ацэньваюцца, асэнсоўваюцца лагічна. З улікам выбранай формы (рэферат, электронная прэзентацыя) афармляюцца вынікі вывучэння тэмы. З гэтымі матэрыяламі студэнты прымаюць удзел на семінары № 6.

1. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.174 – 198.
2. Археалогія Беларусі: У 4 т. / Мінск, 1997 – 2001. (чытальная зала БДУКМ).
3. Берасцейскі вазок : зборнік матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый і II дзіцячай абласной навукова-практычнай канферэнцыі. – Брэст : Альтернатива, 2009. – 157 с.
4. Дучыц, Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі X-XIII стст.: (Паводле археал.звестак). – 2-е выд. / Л.У. Дучыц. – Мінск : Бел.навука, 2001. – 78 с.
5. Канапацкі, І.Б. Гісторыя і культура беларускіх татар: [Вучэб. дапам.] / І.Б.Канапацкі, А.І. Смолік. – Мінск, 2000. – 258 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. —Мінск, 2001 – 2011. (чытальная зала БДУКМ).
7. Цітоў, В. С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 297 с. : іл.

Репозиторий БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа дапамагае арганізаваць раўнамернаю дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока і грунтоўна засвоіць яго, дасягнуць своечасовага выканання заданняў, сачыць за індывідуальным рэйтынгам.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на заданні, якія выконваюцца ў камп'ютарных класах і бібліятэках. Яны могуць мець індывідуальны характар і больш высокі ўзровень складанасці, што знойдзе адпаведнае адлюстраванне і ў сістэме ацэнак.

Глыбей засвоіць змест дысцыпліны дапаможа і тэсціраванне. Рубежныя тэставыя кантролі змяшчаюць заданні рознага ўзроўню складанасці і ахопліваюць заданні адкрытай і закрытай формаў, заданні на ўстанаўленне адпаведнасцей і правільнай паслядоўнасці.

### Тэма 1. РЭГІЯНАЛЬНАЯ СТРУКТУРА БЕЛАРУСІ ПА РОЗНЫХ ПРЫМЕТАХ, 6 гадзін

**Заданне для СРС:** вывучыць асаблівасці рэгіянальнага прыроднага, эканамічнага, канфесіянальнага, культурна-гістарычнага раяніравання Беларусі. Кожны студэнт на аснове прапанаванай літаратуры павінен падрыхтаваць адказы на пытанні:

1. Прыроднае раяніраванне Беларусі.
2. Эканамічнае раяніраванне Беларусі.
3. Канфесіянальнае раяніраванне Беларусі.
4. Гісторыка-культурнае раяніраванне Беларусі.

*ЛІТАРАТУРА*

5. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / Бел. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. афарм. Э.Э. Жакевіча, А.М. Хількевіча. – Мн.: БелЭн, – 1996-2004.

Рэпозиторий БГУКИ

6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / рэдкал.: Пашкоў Г.П. (гал. рэд.) і інш.; маст. Жакевіч Э.Э. – Мн. : БелЭн, 1996 – 2003.
7. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мн.: БелЭн, 2001. – 366 с. (Выбраць дэфініцыі аб праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай цэрквах).
8. Кірухіна, Л.Г. Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метад. аспект / Л. Г. Кірухіна; Нац. б-ка Беларусі. – Мн.: Нац. б-ка Беларусі, 2007. – 76 с.
9. Локотко, А.И. Историко-культурные регионы Беларуси / А.И.Локотко. – Мн.: ЕГУ, 2002. – 226 с.: ил.

**Форма кантролю СРС**

1. Праверка пісьмовых паведамленняў,
2. субяседаванне

## Тэма 3. УЗНІКНЕННЕ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫХ АПІСАННЯЎ І ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ВКЛ, 6 гадзін

**Заданне для СРС:** студэнты знаёмяцца з хронікамі і летапісамі, прысвечанымі беларускім рэгіёнам і населеным пунктам (па выбару). Выяўляюць і пісьмова фіксуюць наступныя звесткі:

1. Назва крыніцы, час яе стварэння, імёны храністаў (летапісцаў), біяграфічныя звесткі.
2. Выкарыстаныя крыніцы, кнігазборы, прыватныя архівы і інш.
3. Рэфератыўная анатацыя на змест крыніцы, з выбарачным ці поўным пералікам геаграфічных аб’ектаў. Акцэнтуецца ўвага на адметных гістарычных фактах пэўнай мясцовасці (населенага пункта).
4. Значэнне каментарыяў і іншых элементаў навукова-даведачнага апарату ў сучасных публікацыях тэкстаў хронік (летапісаў).
5. Значэнне хронікі (летапіса) як гістарычнай крыніцы ў святле сучасных навуковых ацэнак.

*ЛІТАРАТУРА*

Беларускія летапісы і хронікі / уклад.У.Арлова; навук.рэд.і аўт.прадм.В.Чамярыцкі. – Мн.: Бел. кнігазбор, 1997. – 430 с.

Репозиторий БГУКИ

Для адказу на пункт 3 выкарыстоўваюцца дэфініцыі ў новых энцыклапедыях (Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. З.Э. Герасімовіч. —Мінск : Бел. энцыкл., 2005 – 2007; Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с. і інш.), падбіраюцца крытычныя матэрыялы па бібліяграфічных дапаможніках.

**Форма кантролю СРС:**

1. Праверка пісьмовых паведамленняў,
2. Выступленні на семінары № 1

## Тэма 4. УЗНІКНЕННЕ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ГЕАГРАФІЧНЫХ І ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ АПІСАННЯЎ І ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ВКЛ, 6 гадзін

**Заданне для СРС:** студэнты вывучаюць дзейнасць і прыродазнаўчыя даследаванні Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.

Выяўляюць і пісьмова фіксуюць наступныя звесткі:

1. Біяграфічныя звесткі аб краязнаўцах.
2. Рэгіёны і напрамкі апісанняў і даследаванняў.
3. Публікацыя вынікаў пошукава-даследчай дзейнасці.
4. Ацэнка дзейнасці.

*ЛІТАРАТУРА*

Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.

**Форма кантролю СРС**

1. Праверка пісьмовых паведамленняў,
2. Выступленні на семінары № 1.

## Тэмы 7, 9. КІРУНКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У 1795 –1917 гг., 16 гадзін

**Заданне для СРС:** падрыхтоўка рэфератаў, прысвечаных знакамітым краязнаўцам. Выбар асобы краязнаўца ажыццяўляецца па жаданні кожнага студэнта. Па бібліяграфічных і фактаграфічных крыніцах выяўляюцца

Рэпозиторий БГУКИ

дакументы, прысвечаныя выбранай персоне, асвятляюцца асноўныя біяграфічныя факты, характарызуюцца напрамкі краязнаўчай дзейнасці, выдатныя дасягненні, новыя падыходы і метады пошукава-даследчай дзейнасці, асноўныя публікацыі.

1. Без-Карніловіча М.О.
2. Грыгаровіча І.І.
3. Даленгі-Хадакоўскага З.
4. Дамбавецкага А.С.
5. Ельскага А.К.
6. Ігнацьева Р.Г.
7. Кіркора А.К.
8. Краснянскага В.Г.
9. Кусцінскага М.Ф.
10. Нарбута Т.
11. Орды Н.
12. Радчанка З.
13. Семянтоўскага А.М.
14. Сыракомлі У.
15. Прадстаўнікоў роду Плятараў
16. Шпілеўскага П.
17. Шукевіча В.А.ці інш.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Аксамітаў, А.С. З душой славяніна: жыццё і дзейнасць З.Я.Даленгі-Хадакоўскага / А.С.Аксамітаў, Л.А.Малаш. – Мн.: Полымя, 1991. – 150 с.: іл. – (Нашы славутыя землякі).
2. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
3. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии. – Спб., 1855. (Магчыма выкарыстаць рэпрынтнае выданне).
4. Беларусь у малюнках Напалеона Орды: другая палова XIX ст. /уклад.: А.М.Кулагін, У.А.Герасімовіч. – Мн.:Ураджай, 2001. – 143 с.
5. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст. / Г.А.Каханоўскі. – Мн. : Навука і тэхніка, 1984. – 119 с.
6. Запартыка, Г.В. І.І.Грыгаровіч / Г.В.Запартыка, А.М.Запартыка // Бел. археаграф. штогоднік. 2001. Вып.2. – Мн., 2001. – С.260 – 267.
7. Ельскі, А. Выбранае: пер. з пол. / Аляксандр Ельскі; [Уклад. Н.Мазоўка і У.Казберука; камент. У.Казберука і інш.; прадм. У.Казберука і К.Цвіркі]. – Мн.: Беларус. кнігазбор, 2004. – Беларусі кнігазбор: БК. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі. (У дадат.: Успаміны пра А.Ельскага).
8. Ненадавец, А.М. Тэадор Нарбут / А.М.Ненадавец – Мн.: Полымя, 1996. – 63 с.: іл.

Репозиторий БГУКИ

9. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.27 – 48.
10. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
11. Цвірка, К. Слова пра Сыракомлю. Быт і культура беларусаў у творчасці “вясковага лірніка” / К.Цвірка. – Мн., 1975. – 200 с.

**Форма кантролю СРС:**

1. Праверка рэфератаў,
2. Выступленні на семінары № 2

## Тэма 11. АРГАНІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎСТВА Ў БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД 1918 – чэрвень 1941 гг.), ЯГО СТРАТЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, 8 гадзін

### Тэст

### І. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Гэтага знакамітага краязнаўца ў час рэпрэсій называлі “князем краязнаўства” (адказ дайце па ўзоры: М.Мялешка) ________________________________________

*Заданне 2.* Старшынёй ЦБК у 1925–1929 гг. быў (адказ дайце па ўзоры: С.Скандракоў) ________________________

*Заданне 3.* Краязнаўчае таварыства пры БДУ узначальваў (адказ дайце па ўзоры: М. Улашчык) __________________

*Заданне 4.* У складзе якіх устаноў існавала ЦБК:

а) ад 1923 да 1930 г.________________

б) у 1930 – 1933 гг.__________________

*Заданне 5.* Укажыце падзею, якая адбылася ў краязнаўчым руху БССР у:

а) лютым 1926 г.__________________

б) лютым 1927 г.__________________

в) студзені 1930 г. _________________

*Заданне 6.* ЦБК распрацавала “Палажэнне аб раённых бюро краязнаўства” ў _________ г.

*Заданне 7.* Часопіс “Наш край” выдаваўся ў ___________гг.

*Заданне 8.* Назавіце грамадскую арганізацыю, у складзе якой функцыянавалі краязнаўчыя гурткі, дэлегатуры, аддзелы і акругі _____________

Репозиторий БГУКИ

*Заданне 9.* Бібліяграфічныя паказальнікі “Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе” і “Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну” выпускала ___________

**II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)**

*Заданне 10.* Цэнтральная краязнаўчая картатэка вялася ў:

а) Магілёўскім акруговым таварыстве краязнаўства,

б) Дзяржаўнай бібліятэцы БССР,

в) Навуковым таварыстве па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках.

*Заданне 11.* Прозвішча складальніка “Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны”:

а) А.Я.Крукоўскі,

б) М.Я.Байкоў,

в) І.К.Бялькевіч,

г) М.В.Шатэрнік.

*Заданне 12.* Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках мела статус:

а) асобнай навуковай установы Інбелкульта,

б) сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта,

в) камісіі ЦБК.

*Заданне 13.* У якім афіцыйным дакуменце ўказвалася, што няма неабходнасці ствараць асобныя краязнаўчыя арганізацыі:

а) пастанова СНК БССР “Аб развіцці музейнай і краязнаўчай справы БССР” ад 17 лютага 1937 г.

б) распараджэнне Наркамасветы “Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы” ад 25 красавіка 1937 г.

*Заданне 14.* Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя выдавала:

а) “Атэнэум Віленскі”,

б) “Бібліяграфія гісторыі зямель б.В.Кс.Літоўскага за год…”,

в) “Калосьсе”.

*Заданне 15.* Конкурсы на лепшую манаграфію на польскай мове аб мінулым ваяводства, павета, горада, мястэчка праводзіла:

а) Упраўленне студэнцкага кола ПКТ,

б) Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя,

в) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску.

Репозиторий БГУКИ

## III. Суаднясіце

*Заданне 16.* Дзеячаў краязнаўства з арганізацыямі, у якіх яны працавалі:

| | |
|---|---|
| 1. М.Каспяровіч | а) Краязнаўчае таварыства пры БДУ |
| 2. І.Бялькевіч | б) Таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ |
| 3. А.Луцкевіч | в) Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства |
| 4. П.Салаўёў | г) Краязнаўчае таварыства Мсціслаўскага педтэхнікума |
| 5. Р.Гарашкевіч | д) Беларускі гістарычна-этнаграфічны музей (Вільня) |
| 6. М.Улашчык | ж) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску |

*Заданне 17.* Імёны краязнаўцаў і праяўленне іх дзейнасці:

| | |
|---|---|
| 1. Ю.Ядкоўскі | а) Этнаграфічныя даследаванні |
| 2. Ф.Ждановіч | б)Збіранне рэгіянальнага слоўнага матэрыялу |
| 3. А.Шлюбскі | в) Прыродазнаўчыя даследаванні |
| 4. А.Фядзюшын | г) Даследаванні мастацтва |
| 5. З.Магілёўчык | д) Санітарна-гігіенічныя ўмовы |
| 6. І.Бірыла | е) Актывіст разгрому краязнаўчага руху |
| 7. М.Каспяровіч | ж) Стварэнне краязнаўчага музея ў Гродне |
| 8.Р.Выдра | з) Рэгіянальная паталогія |

***Заданне 18.* Назвы краязнаўчых выданняў і іх аўтараў:**

| | |
|---|---|
| 1.“Гісторыя Браслаўскага павета” | а) М.Каспяровіч |
| 2. “Вільчынскія паляне” | б) Ф.Ждановіч |
| 3. “Віцебскі краёвы слоўнік” | в) А.Сербаў |
| 4. “Матэрыялы да вывучэння | г) А.Шлюбскі |

Репозиторий БГУКИ

| | |
|---|---|
| фальклору і мовы Віцебшчыны” | |
| 5. “Адраджэнне беларускага тэатра на Міншчыне” | д) О.Гедэман |

## IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 19.* У пастанове “Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху” (чэрвень 1932 г.) СНК БССР паставіў задачу ўзмацніць краязнаўчую работу ў школах.

*Заданне 20.* У пачатку 30-х гг. краязнаўцы-гісторыкі вывучалі гісторыю вытворчасці і тэхнікі.

*Заданне 21.* У 1929 г. у БССР было 167 грамадскіх краязнаўчых арганізацый, у якіх налічвалася 5000 членаў.

*Заданне 22.* Аршанскае акруговае краязнаўчае таварыства выпусціла зборнік “Віцебшчына”.

## V. Што аб’ядноўвае

*Заданне 23.* Р.К.Шукевіч-Трацякоў, С.В.Скандракоў, В.Д.Друшчыц, М.В.Азбукін, І.А.Сербаў, К.Крапіва ________

_____________________________________________________

*Заданне 24.* П.Алевінскі, Д.Георгіеўскі, С.Тамашэвіч, Р.Гарашкевіч ________________________________________

*Заданне 25.* П.Ф.Салаўёў, Ф.В.Лунгерсгаўзен, М.Ганчарык ___________________________________________________

## VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 26.* Студэнт БДУ, адзін з арганізатараў краязнаўчага таварыства БДУ, аўтар успамінаў пра станаўленне краязнаўчай працы гэтай арганізацыі, удзельнік краязнаўчых “бадзянняў у 1924–1929 гг.”, у далейшым знакаміты гісторык і крыніцазнавец _____________________________________

*Заданне 27.* Вывучаў птушак і іншых прадстаўнікоў фауны. У 1924 г. у вярхоўях Бярэзіны і яе прытоках знайшоў вялікае паселішча баброў, выступіў з ініцыятывай стварэння запаведніка для захавання каштоўнага і рэдкага на той час віду ________________________________________________

*Заданне 28.* Прафесар БДУ і старшы навуковы супрацоўнік АН БССР, адзін з актыўных пагромшчыкаў краязнаўства, аўтар артыкула “Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР” __________________________________________

*Заданне 29.* Заснавальнік Беларускага навуковага таварыства і знакамітага Беларускага музея ў Вільні, апантаны збіральнік старажытнасцей _____________________________

Рэпазіторый БГУКИ

*Заданне 30.* Удзельнік беларускага нацыянальнага руху, стваральнік вядомай прыватнай бібліятэкі ў Вільні, у якой былі багаты фонд выданняў і рукапісаў, прысвечаных беларускім тэрыторыям, а таксама каталог мясцовых (заходнебеларускіх) дакументаў. Меў славу "самага працавітага і найсумленнейшага бібліятэкара, уражваў эрудыцыяй і памяццю бібліёграфа".

**Форма кантролю СРС:**

1. Пісьмовае тэсціраванне,
2. Выступленні на семінары № 3

## Тэма 13. КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939 гг.), 4 гадзіны

**Заданне для СРС:** кожны студэнт на аснове прапанаванай літаратуры павінен падрыхтаваць адказы на пытанні:

1. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці ў Заходняй Беларусі.
2. Дзяржаўнае навуковае краязнаўства; даследаванні беларускіх тэрыторый у Віленскім універсітэце імя С.Баторыя.
3. Грамадскі краязнаўчы рух. Удзел аматараў краязнаўства ў дзейнасці Польскага краязнаўчага таварыства.
4. Краязнаўчая дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый.
   4.1.Беларусі музей Івана Луцкевіча.
   4.2.Краязнаўчы друк.
   4.3.Выдатныя дзеячы краязнаўства ў Заходняй Беларусі.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі (1918 – 1941 гг.) / А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 164 с.
2. Малаш, Ю. Язэп Драздовіч – вандроўнік, мастак, гісторык //Ю.Малаш / Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С.78 – 82.
3. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.132 – 152.
4. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
5. Саітава, В.І. Краязнаўчая работа ў Лідзе (20-30-я гг.) / В.І.Саітава // Бібліятэчны свет. –1999. – № 3. – С.22 – 23.
6. Саитова, В.И. Журнал "Ateneum Wileńskie" / В.И.Саитова // Библиография. – 1999. – № 5. – С. 82–91.


Рэпазіторый БГУКІ

7. Цітовіч, І.У. Даследаванне Заходняй Беларусі дзяржаўнымі краязнаўчымі арганізацыямі ІІ Рэчы Паспалітай / І.У.Цітовіч // VI межвуз. конф. молодых ученых, Брест, 14 мая 2004 г. / Брест. гос. ун-т им. А.С.Пушкина; под общ. ред. А.А.Горбацкого. – Брест, 2004. – С. 148–150.

**Форма кантролю СРС**

1.Праверка пісьмовых прац,

2. Выступленні на семінары № 3

## Тэма 14. АДНАЎЛЕННЕ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БССР І ЯЕ АРГАНІЗАЦЫЯ Ў 1945 –1980-я гг., 6 гадзін

**Заданне для СРС:** кожны студэнт на аснове выяўленай літаратуры рыхтуе пісьмовае паведамленне па выбранай тэме:

1. Краязнаўчыя кірункі дзейнасці грамадскіх арганізацый (Беларускага фонду культуры, Таварыства аховы помнікаў і інш.)
2. Школьнае краязнаўства. Рух чырвоных следапытаў.
3. Развіццё краязнаўчых музеяў.
4. Развіццё краязнаўчай дзейнасці ў бібліятэках.
5. Выдатныя краязнаўцы (І.Стаброўскі, Г.Каханоўскі, М.Мельнікаў ці інш. )

*ЛІТАРАТУРА*

**Асноўная**

1. Ляшук, В.Я. Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я.Ляшук, Г.М.Снітко. – Мн.: Литература и искусство, 2008. – 318 с.
2. Мешечко, Е.Н. Географическое краеведение : учеб. пособие / Е.Н.Мешечко – Мн. : Изд-во БДУ, 2002. – С. 12 – 34.
3. Півавар, М.В. Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / М.В.Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 3. – С. 46–52.
4. Развитие исторического краеведения // Историческое краеведение Белоруссии : учеб пособие. – Мн. : Изд-во БДУ, 1980. – С.25 – 44.
5. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн., 2009. – С.153 – 173.
6. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў

Репозиторий БГУКИ

**Дадатковая**

1. Амелькович, Л.Г. Белорусская краеведческая библиография / Л.Г.Амелькович // Отраслевые библиографии БССР / под общ. ред. В.А.Фокеева, Н.В.Иванова. – Мн.: Выш. шк., 1979. – Глава 9. – С.172–191.
2. Симановский, И.Б. Белорусская советская библиография / И.Б. Симановский. – Мн., 1965. – Ч. 1. – С. 22, 30, 33–38, 55 – 57, 97 – 102.

**Крыніцы выяўлення літаратуры:**

Каталогі і БД бібліятэк, органы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, бюлетэнь “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку” (1960 – 1980).

**Форма кантролю СРС**

**1.Праверка пісьмовых прац.**

## Тэма 15. АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У БССР У 1945 – 1980-я гг., 6 гадзін

**Заданне для СРС:** кожны студэнт на аснове выяўленай літаратуры ацэньвае краязнаўчую каштоўнасць дакументаў (КД) па зместу і па іншых дапаможных крытэрыях.

Кожны студэнт выяўляе 6 – 8 выданняў, апублікаваных у 1945 – 1980-х гг. і пісьмова праводзіць экспертызу іх краязнаўчай каштоўнасці, вызначаючы кожную з агульных і дапаможных прымет гэтых дакументаў.

Пры аналізе выкарыстоўваць наступныя лічбавыя паказчыкі:

-КД, змястоўна звязаны з краем – 100 балаў;

-КД шырокага сацыяльнага прызначэння – 20 балаў;

-КД, функцыянальна прызначаны для вывучэння края – 20 балаў;

-КД, створаны і выдадзены ў краі – 20 балаў;

-КД комплекснага характару – 10 балаў;

-КД, які цалкам прысвечаны краю – 10 балаў;

-КД, створаны мясцовым аўтарам – 5 балаў;

-КД, надрукаваны на дзяржаўнай мове або мове карэннага насельніцтва – 3 бала;

-КД, дзе супадае час стварэння, выдання і апісаных падзей – 2 балы

-КД, змест якога састарэў (па ідэалагічных прычынах, навуковых высновах, фактаграфіі і іншых паказчыках) – мінус – 100 балаў.

Калі КД набраў 200 балаў – гэта ідэальна каштоўны ў краязнаўчым сэнсе дакумент, які мясцовая бібліятэка захоўвае ў складзе ядра краязнаўчага фонду (КФ).

**Крыніцы выяўлення літаратуры:**



Репозиторий БГУКИ

Каталогі і БД бібліятэк, органы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, бюлетэнь “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку” (1960 – 1980).

**Форма кантролю СРС**

1.Праверка пісьмовых прац,

2. субяседаванне

## Тэма 17. РАЗВІЦЦЁ ГРАМАДСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА РУХУ (1991 – 2010-я гг.), 8 гадзін

**Заданне для СРС:** кожны студэнт на аснове выяўленай літаратуры рыхтуе пісьмовае паведамленне аб дзейнасці адной грамадскай краязнаўчай арганізацыі. Выкарыстоўваецца “Краязнаўчая газета”, а таксама бібліяграфічныя крыніцы (бягучыя паказальнікі “Новая літаратура аб …вобласці”, “Летапіс газетных артыкулаў” і інш.). Таксама праводзіцца пошук па сайтах краязнаўчых арганізацый у Інтэрнет.

**Форма кантролю СРС**

1. Субяседаванне па тэме,
2. выступленні на семінары № 5

## Тэма 19. АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ (1991 – 2010-я гг.), 12 гадзін

*Заданне 1.* кожны студэнт на аснове выяўленай літаратуры рыхтуе электронную прэзентацыю, прысвечаную дзейнасці аднаго калектыўнага суб’екта на выбар:

- ✓ Дзяржаўнага краязнаўчага музея
- ✓ Навукова-даследчай установы
- ✓ Бібліятэкі.

*Заданне 2:* студэнты вывучаюць і ацэньваюць уклад выдатных краязнаўцаў у даследаванне гісторыі беларускіх рэгіёнаў. Звяртаюць увагу на выкарыстоўваемыя краязнаўцамі крыніцы і метады ў пошукава-даследчай дзейнасці

| Навуковыя працы і іх значэнне для развіцця краязнаўства | | |
|---|---|---|
| Прозвішча даследчыка, асноўныя біяграфічныя звесткі | Бібліяграфічнае апісанне працы, яе асноўны змест, выкарыстаныя метады | Роля даследчыка і яго прац для развіцця краязнаўства |

**Форма кантролю СРС**

1.Дэманстрацыя прэзентацый,

2. выступленніна семінары № 6

Рэпазіторый БГУКИ

# ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ ПА АСНОЎНЫХ РАЗДЗЕЛАХ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел “Узнікненне краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (да 1794 г.)”

1. Ахарактарызуйце гістарычныя і культурныя фактары, якія спрыялі ўзнікненню краязнаўства на беларускіх землях.

2. Назавіце даследчыкаў, якія першымі пачалі шырока выкарыстоўваць архіўныя і бібліятэчныя матэрыялы для вывучэння мінулага беларускіх зямель.

3. Хто вывучаў гісторыю хрысціянства на Полацкай зямлі? Ці можна лічыць гэтага даследчыка адным з буйнейшых пачынальнікаў беларускага краязнаўства?

4. Ахарактарызуйце краязнаўчыя даследаванні Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.

5. Хто стварыў лепшую карту ВКЛ, наколькі поўна адлюстраваны на ёй населеныя пункты на беларускіх землях?

6. Якія меры прымала Адукацыйная камісія для развіцця краязнаўства ў школах?

7. Ахарактарызуйце першыя бібліяграфічныя краязнаўчыя матэрыялы.

## Раздзел “Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1795–1917)”

1. Якія формы краязнаўства развіваліся ў названы гістарычны перыяд?

2. Ахарактарызуйце дзейнасць буйнейшых краязнаўцаў.

3. Ахарактарызуйце дзейнасць грамадскіх краязнаўчых арганізацый.

4. Ахарактарызуйце краязнаўчыя даследаванні ў Віленскім універсітэце, Полацкай езуіцкай акадэміі, Горы-Горацкай земляробчай школе.

5. Якія адміністрацыйныя і навуковыя ўстановы прадстаўлялі дзяржаўнае краязнаўства?

6. Хто з краязнаўцаў працаваў у губстаткамітэтах?

7. Ахарактарызуйце краязнаўчыя перыядычныя выданні.

8. У якіх бібліятэках былі фонды краязнаўчай літаратуры?

9. Ахарактарызуйце краязнаўчую бібліяграфічную прадукцыю ўказанага перыяду.

10. Прывядзіце прыклады краязнаўчых збораў у прыватных музеях.

Репозиторий БГУКИ

## Раздзел “Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі (1918–1945)”

1. Ахарактарызуйце ўплыў грамадскіх умоў на развіццё краязнаўства ў БССР.

2. Раскрыйце структуру краязнаўчых арганізацый у БССР, ахарактарызуйце ролю і кірункі дзейнасці Цэнтральнага бюро краязнаўства.

3. Ахарактарызуйце значэнне часопіса “Наш край” у краязнаўчым руху ў рэспубліцы.

4. Назавіце буйнейшых краязнаўцаў БССР.

5. Якія прычыны прывялі да разбурэння краязнаўчага руху ў БССР?

6. Ахарактарызуйце грамадскія ўмовы развіцця краязнаўства ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.

7. Ахарактарызуйце структуру Польскага краязнаўчага таварыства.

8. Прывядзіце прыклады лепшых дасягненняў краязнаўчай дзейнасці дзеячаў і арганізацый нацыянальнага беларускага руху.

9. Назавіце буйнейшых заходнебеларускіх краязнаўцаў.

10. Ахарактарызуйце перыядычныя краязнаўчыя выданні ў Заходняй Беларусі.

11. Вызначце моцныя і слабыя бакі арганізацыі краязнаўства ў БССР і ў Заходняй Беларусі.

## Раздзел “Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі ў 1946–1980-я гг.”

1. Ахарактарызуйце арганізацыйную структуру краязнаўства.

2. У чым выяўляецца ўплыў грамадскіх умоў на краязнаўчую дзейнасць?

3. Па якіх кірунках развівалася школьнае краязнаўства?

4. Якія грамадскія арганізацыі ўдзельнічалі ў краязнаўчым руху?

5. Назавіце буйнейшых краязнаўцаў перыяду.

6. Якія грамадскія ўмовы спрыялі стварэнню Беларускага краязнаўчага таварыства? Ахарактарызуйце яго задачы і кірункі дзейнасці. Хто яго ўзначаліў?

7. Па якіх кірунках вялося развіццё краязнаўчай дзейнасці бібліятэк?

## Раздзел “Развіццё краязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2010-я гг.)”

1. Як уплываюць сучасныя грамадскія ўмовы на стан і развіццё краязнаўчага руху? Што спрыяла ўздыму грамадскага краязнаўства?

2. Ахарактарызуйце арганізацыю грамадскага краязнаўства. Ці дзейнічае Беларускае краязнаўчае таварыства?

Рэпазіторый БГУКИ

3. Якое перыядычнае выданне з’яўляецца цэнтральным сярод краязнаўчых перыядычных органаў Беларусі?

4. Назавіце буйнейшых сучасных краязнаўцаў.

5. Ахарактарызуйце арганізацыю школьнага краязнаўства і формы краязнаўчай дзейнасці школьнікаў.

6. Якія новыя формы краязнаўчай дзейнасці з'явіліся на сучасным этапе?

7. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі і дасягненні бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

Репозиторий БГУКИ

## ТЭСТЫ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ СТУДЭНТАЎ

### Тэст па раздзелу “Узнікненне краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (да 1794 г.)

#### І. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Гісторыю хрысціянства ў Полацкай зямлі ў XVIII ст. вывучаў (адказ даць па ўзоры: К.Нясецкі)__________
_____________________________________________________

*Заданне 2.* Аўтарам даследавання “Флора Літвы” ў 5-ці тамах (Гродна–Вільня) быў _______________________________

*Заданне 3.* Першую навуковую калекцыю мінералаў і раслін Гродзеншчыны ў XVIII ст. сфарміраваў ____________
_____________________________________________________

#### ІІ. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 4.* Хто з краязнаўцаў выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі (Галоўнай школе ВКЛ)?

а) В.В.Каяловіч,
б) Ж.Э.Жылібер,
в) А.Нарушэвіч,
г) С.Б.Юндзіл.

#### ІІІ. Суаднясіце

*Заданне 5.* Краязнаўчыя творы і іх аўтараў

| | |
|---|---|
| 1. “Два вялікія светачы на гарызонце Полацкім…” | а) С.Б.Юндзіл |
| 2. “Флора Літвы” | б) І.Сцябельскі |
| 3. “Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі Вялікага княства Літоўскага...” | в) Ж.Э.Жылібер |
| 4.“Magni Ducatus Lithuaniae…” | г) Я.Ласіцкі |
| | д) Т.Макоўскі |
| | е) М.Стрыйкоўскі |

#### IV. Размяркуйце ў храналагічнай паслядоўнасці дзейнасць краязнаўцаў

*Заданне 6.* М.Стрыйкоўскі, С.Б.Юндзіл, В.В.Каяловіч.

Репозиторий БГУКИ

**V. Ці згодны Вы са сцвярджэннем? (Так/Не)**

*Заданне 7.* У перыяд ВКЛ дамінавала школьнае краязнаўства.

*Заданне 8.* Аўтарам “Хронікі еўрапейскай Сарматыі” быў А.Гваньіні.

*Заданне 9.* Адукацыйная камісія спрыяла пачатку краязнаўчай работы ў школах.

*Заданне 10.* Вучэбная дысцыпліна “Краязнаўства” выкладалася ў Галоўнай школе ВКЛ.

**VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца**

*Заданне 11.* Бедны малады чалавек, выхадзец з Мазоўша, ваенны найміт, служыў у Віцебску. Захапляўся мінулым беларускіх мясцін, шукаў мецэнатаў, каб атрымаць доступ да архіваў і бібліятэк беларускіх магнатаў. Спалучыў у краязнаўчых даследаваннях уласныя назіранні і вывучэнне гістарычных дакументаў. Аўтар апублікаваных хронік.

*Заданне 12.* Ураджэнец Ліёна, урач, арганізатар медыцын-скай акадэміі ў Гродне, даследчык прыроды паўночна-заходніх і цэнтральных зямель Беларусі.

*Заданне 13.* Ураджэнец Лідскага павета, манах піярскага ордэна, вывучаў расліны, імкнуўся заняць пасаду бібліятэкара ў Галоўнай школе ВКЛ.

Репозиторий БГУКИ

## Тэст па раздзелу “Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1795–1917)”

### I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Выдаўцом часопіса “Рубон” быў (адказ дайце па ўзоры: І.Храпавіцкі) ___________________________________

*Заданне 2.* Віленскі музей старажытнасцей і археалагічную камісію заснаваў (адказ дайце па ўзоры: А.Плятар)_________

*Заданне 3.* Працу “Быт белорусских крестьян Витебской губернии” (1854), падрыхтаваную на аснове праграмы РГТ, напісаў (адказ дайце па ўзоры: М.Кусцінскі)_______________

*Заданне 4.* Віцебская вучоная архіўная камісія была створана ў _________ г.

*Заданне 5.* Бібліяграфічныя паказальнікі па археалогіі Мінскай губерні склаў (адказ дайце па ўзоры: Я.Карскі) _____________________________________________________

*Заданне 6.* Выданні тыпу памятных кніжак губерній і аглядаў губерній рыхтаваліся (адказ дайце па ўзоры: губернскімі сельскагаспадарчымі таварыствамі) ___________

______________________________________________________

### II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы):

*Заданне 7.* У краязнаўчай дзейнасці ў першай палове – сярэдзіне ХІХ ст. удзельнічалі:

а) члены гуртка Румянцава,
б) Таварыства па вывучэнні Магілёўскай губерні,
в) Віленскі універсітэт,
г) Віленская археалагічная камісія,
д) Віленскі музей старажытнасцей,
е) губернскія статкамітэты,
ж) Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актаў.

*Заданне 8.* У краязнаўчай дзейнасці ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. удзельнічалі:

а) Віцебская вучоная архіўная камісія,
б) Віленскі універсітэт,
в) губернскія статкамітэты,
г) Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актаў,
д) царкоўна-археалагічныя камітэты,
е) Заходні аддзел РГТ,
ж) губернскія і павятовыя таварыствы ўрачоў.

*Заданне 9.* Пад кіраўніцтвам РГТ праводзіліся:

Репозиторий БГУКИ

а) этнаграфічныя і фальклорныя экспедыцыі,

б) экскурсіі ў Віленскім музеі старажытнасцей.

*Заданне 10.* І.Грыгаровіч быў супрацоўнікам:

а) часопіса “Месячнік Полацкі”,

б) гуртка графа Румянцава,

в) Віленскага універсітэта,

г) Мінскага губстаткамітэта.

*Заданне 11.* Краязнаўчай работай займаліся прафесары Віленскага універсітэта:

а) І.Даніловіч,

б) К.Тышкевіч,

в) Н.Орда,

г) Ж.Анацэвіч.

*Заданне 12.* Віленскі музей старажытнасцей арганізаваны з:

а) прыватнай калекцыі Тышкевічаў,

б) прыватнай калекцыі мінскага губернатара Сямёнава,

в) калекцый РГТ,

г) матэрыялаў губстаткамітэтаў.

*Заданне 13.* Да ліку першых грамадскіх арганізацый краязнаўчага кірунку ў Беларусі належалі:

а) губернскія статкамітэты,

б) вайсковыя часці Расійскай арміі,

в) Беларускае таварыства сельскіх гаспадароў,

г) Віленскі музей старажытнасцей,

д) Віленская археалагічная камісія.

*Заданне 14.* Археалагічнымі раскопкамі ў рэгіёнах актыўна займаліся:

а) І.Грыгаровіч,

б) А.Рыпінскі,

в) Е.Раманаў,

г) А.Кіркор,

д) М.Доўнар-Запольскі.

*Заданне 15.* Анкеты (праграмы) для збору звестак аб жыцці сялян распаўсюджваліся:

а) РГТ,

б) Віцебскай вучонай архіўнай камісіяй,

в) прыватнымі краязнаўчымі музеямі,

г) губернскімі і павятовымі таварыствамі ўрачоў.

*Заданне 16.* Афіцэрамі Генштаба Расійскай арміі былі выдадзены:

а) выпускі “Месячніка Полацкага”,

Рэпазіторый БГУКИ

б) “Гісторыя літоўскага народа”,
в) гістарычна-статыстычныя апісанні беларускіх губерняў,
г) агляды губерняў.

### III. Суаднясіце

*Заданне 17.* Дзеячаў краязнаўчага руху і цэнтры (установы), у якіх яны працавалі (ці стварылі іх):

| | |
|---|---|
| 1. Э.Чапскі | а) Віцебскі губернскі статкамітэт |
| 2. А.С.Дамбавецкі | б) Прыватны музей, Станькава |
| 3. А.Ельскі | в) Магілёўскае губернскае праўленне, губернатар |
| 4. Е.Р.Раманаў | г) Прыватны музей, Замосце Ігуменскага павета |
| 5. А.П.Сапуноў | д) Таварыства па вывучэнні беларускага краю |

*Заданне 18.* Аўтараў і іх краязнаўчыя працы:

| | |
|---|---|
| 1. К.Тышкевіч | а) “Витебская старина” |
| 2. А.П.Сапуноў | б) “Очерки Витебской Беларуси” |
| 3. Е.Р.Раманаў | в) “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах” |
| 4. М.Я.Нікіфароўскі | г) “Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях” |
| 5. У.Сыракомля | д) “Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский” |
| 6. А.С.Дамбавецкі | е) “Падарожжа па Палессі і беларускім краі” |
| 7. Я.Тышкевіч | ж) “Нарыс паўночнай Беларусі” |
| 8. Я.Баршчэўскі | з) “Апісанне Барысаўскага павета” |
| 9. П.Шпілеўскі | і) “Вілія і яе берагі” |

Репозиторий БГУКИ

***Заданне 19.*** **Імёны краязнаўцаў і праяўленне іх дзейнасці:**

| | |
|---|---|
| 1. Я.Булгак | а) “Скарбніца грамат” |
| 2. Я.Тышкевіч | б) Малюнкі гістарычных помнікаў, маёнткаў, палацаў, канфесіянальных установ, ландшафтных відаў |
| 3. І.Даніловіч | в) Арніталагічны музей у Паставах |
| 4. Э.Гутэн-Чапскі | г) Краязнаўчая фатаграфія |
| 5.К.Тызенгаўз | д) Віленскі музей старажытнасцей і Археалагічная камісія |
| 6. Н.Орда | е) Музей “скарбніца” і бібліятэка ў Станькаве |

***Заданне 20.*** **Суаднясіце архіўныя ўстановы і іх выданні:**

| | |
|---|---|
| 1. Віцебскі цэнтральны архіў | а) “Витебская старина” |
| 2. Віленская археаграфічная камісія | б) “Каталог древних актовых книг губерний: Виленской, Гродненской, Минской и Ковенской…” |
| 3. Віцебская вучоная архіўная камісія | в) “Историко-юридические материалы, извлечёные из архивных книг губерний: Виленской и Могилёвской…” |
| | д) “Полоцко-Витебская старина” |

**IV. Размяркуйце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

*Заданне 21.* Я.Булгак, Я.Чачот, Э.Чапскі.

**V. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?**

*Заданне 22.* У Полацкай езуіцкай акадэміі вяліся сельскагаспадарчыя рэгіянальныя даследаванні.

*Заданне 23.* Органам Польскага краязнаўчага таварыства быў часопіс “Край” (“Kraj”).

*Заданне 24.* У 1916 г. у Мінску ўзніклі грамадскія арганізацыі, якія займаліся выяўленнем помнікаў даўніны ў рэгіёне і іх аховай.

*Заданне 25.* Дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей і Археалагічнай камісіі атрымала падтрымку з боку царскага ўрада.

*Заданне 26.* У краязнаўчых даследаваннях у XIX ст. пачалі прымаць удзел прадстаўнікі сялянства.

Репозиторий БГУКИ

*Заданне 27.* Паўночна-Заходні аддзел РГТ паставіў пытанне аб падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

## VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 28.* Хто з краязнаўцаў у пачатку XIX ст. збіраў народныя батанічныя, астранамічныя і іншыя тэрміны, матэрыялы па дыялекталогіі, тапаніміцы, археалогіі, падрыхтаваў "Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў" і палымяна заклікаў вывучаць народную спадчыну: "Трэба пайсці і схіліцца пад страху селяніна ў розных аддаленых старонках, трэба спяшацца на яго святы, забавы і розныя прыгоды. Там, у дыме, які ўздымаецца над галовамі, снуюць яшчэ старыя абрады, спяваюцца даўнія спевы і ў плясках просталюдзінаў называюцца імёны забытых багоў".

*Заданне 29.* Пра якога краязнаўца першай паловы XIX ст. Р.А.Падбярэскі напісаў: "Трэба ведаць яго асабіста, трэба яго бачыць з кіем паломніка ў руцэ, так як я яго спаткаў у маіх падарожжах, пешшу, сярод беларускага люду, на плытах Дзвіны, у прыдарожных карчмах, на сцежках ледзь прыметных у лесе і на вялікіх дарогах".

*Заданне 30.* Хто з краязнаўцаў стварыў выдатны прыватны музей і бібліятэку ў маёнтку Замосце Ігуменскага павета, напісаў многа краязнаўчых прац, у "Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін" змясціў вялікую колькасць артыкулаў пра населеныя пункты і геаграфічныя аб'екты на беларускіх землях?

*Заданне 31.* Хто з краязнаўцаў у лісце да Ю.Крашэўскага пісаў, што пажадана было б заняцца "выданнем правінцыяльных штогоднікаў, у якіх бы збіраліся гістарычныя, археалагічныя, фізічныя, статыстычныя звесткі, карысныя для апісання нашага краю," сам праводзіў археалагічныя раскопкі ў Падзвінні, апублікаваў многа артыкулаў краязнаўчага зместу?

Репозиторий БГУКИ

**Тэст па раздзелу “Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі (1918–1945)”**

**I. Дапоўніце сказы**

*Заданне 1.* Гэтага знакамітага краязнаўца ў час рэпрэсій называлі “князем краязнаўства” (адказ дайце па ўзоры: М.Мялешка) ________________________________________

*Заданне 2.* Старшынёй ЦБК у 1925–1929 гг. быў (адказ дайце па ўзоры: С.Скандракоў) _________________________

*Заданне 3.* Краязнаўчае таварыства пры БДУ узначальваў (адказ дайце па ўзоры: М. Улашчык) ___________________

*Заданне 4.* У складзе якіх устаноў існавала ЦБК:

а) ад 1923 да 1930 г.________________

б) у 1930 – 1933 гг.____________ ______

*Заданне 5.* Укажыце падзею, якая адбылася ў краязнаўчым руху БССР у:

а) лютым 1926 г.__________________

б) лютым 1927 г.__________________

в) студзені 1930 г. _________________

*Заданне 6.* ЦБК распрацавала “Палажэнне аб раённых бюро краязнаўства” ў _________ г.

*Заданне 7.* Часопіс “Наш край” выдаваўся ў ___________гг.

*Заданне 8.* Назавіце грамадскую арганізацыю, у складзе якой функцыянавалі краязнаўчыя гурткі, дэлегатуры, аддзелы і акругі _____________

*Заданне 9.* Бібліяграфічныя паказальнікі “Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе” і “Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну” выпускала ___________

**II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)**

*Заданне 10.* Цэнтральная краязнаўчая картатэка вялася ў:

а) Магілёўскім акруговым таварыстве краязнаўства,

б) Дзяржаўнай бібліятэцы БССР,

в) Навуковым таварыстве па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках.

*Заданне 11.* Прозвішча складальніка “Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны”:

а) А.Я.Крукоўскі,

б) М.Я.Байкоў,

в) І.К.Бялькевіч,

г) М.В.Шатэрнік.

*Заданне 12.* Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках мела статус:

а) асобнай навуковай установы Інбелкульта,



Репозиторий БГУКИ

б) сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта,

в) камісіі ЦБК.

*Заданне 13.* У якім афіцыйным дакуменце ўказвалася, што няма неабходнасці ствараць асобныя краязнаўчыя арганізацыі:

а) пастанова СНК БССР "Аб развіцці музейнай і краязнаўчай справы БССР" ад 17 лютага 1937 г.

б) распараджэнне Наркамасветы "Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы" ад 25 красавіка 1937 г.

*Заданне 14.* Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя выдавала:

а) "Атэнэум Віленскі",

б) "Бібліяграфія гісторыі зямель б.В.Кс.Літоўскага за год…",

в) "Калосьсе".

*Заданне 15.* Конкурсы на лепшую манаграфію на польскай мове аб мінулым ваяводства, павета, горада, мястэчка праводзіла:

а) Упраўленне студэнцкага кола ПКТ,

б) Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя,

в) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску.

**III. Суаднясіце**

*Заданне 16.* Дзеячаў краязнаўства з арганізацыямі, у якіх яны працавалі:

| | |
|---|---|
| 1. М.Каспяровіч | а) Краязнаўчае таварыства пры БДУ |
| 2. І.Бялькевіч | б) Таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ |
| 3. А.Луцкевіч | в) Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства |
| 4. П.Салаўёў | г) Краязнаўчае таварыства Мсціслаўскага педтэхнікума |
| 5. Р.Гарашкевіч | д) Беларускі гістарычна-этнаграфічны музей (Вільня) |
| 6. М.Улашчык | ж) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску |

*Заданне 17.* Імёны краязнаўцаў і праяўленне іх дзейнасці:

| | |
|---|---|
| 1. Ю.Ядкоўскі | а) Этнаграфічныя даследаванні |
| 2. Ф.Ждановіч | б)Збіранне рэгіянальнага слоўнага матэрыялу |

Репозиторий БГУКИ

| | |
|---|---|
| 3. А.Шлюбскі | в) Прыродазнаўчыя даследаванні |
| 4. А.Фядзюшын | г) Даследаванні мастацтва |
| 5. З.Магілёўчык | д) Санітарна-гігіенічныя ўмовы |
| 6. І.Бірыла | е) Актывіст разгрому краязнаўчага руху |
| 7. М.Каспяровіч | ж) Стварэнне краязнаўчага музея ў Гродне |
| 8.Р.Выдра | з) Рэгіянальная паталогія |

***Заданне 18.*** **Назвы краязнаўчых выданняў і іх аўтараў:**

| | |
|---|---|
| 1.“Гісторыя Браслаўскага павета” | а) М.Каспяровіч |
| 2. “Вільчынскія паляне” | б) Ф.Ждановіч |
| 3. “Віцебскі краёвы слоўнік” | в) А.Сербаў |
| 4. “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны” | г) А.Шлюбскі |
| 5. “Адраджэнне беларускага тэатра на Міншчыне” | д) О.Гедэман |

## IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 19.* У пастанове “Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху” (чэрвень 1932 г.) СНК БССР паставіў задачу ўзмацніць краязнаўчую работу ў школах.

*Заданне 20.* У пачатку 30-х гг. краязнаўцы-гісторыкі вывучалі гісторыю вытворчасці і тэхнікі.

*Заданне 21.* У 1929 г. у БССР было 167 грамадскіх краязнаўчых арганізацый, у якіх налічвалася 5000 членаў.

*Заданне 22.* Аршанскае акруговае краязнаўчае таварыства выпусціла зборнік “Віцебшчына”.

## V. Што аб’ядноўвае

*Заданне 23.* Р.К.Шукевіч-Трацякоў, С.В.Скандракоў, В.Д.Друшчыц, М.В.Азбукін, І.А.Сербаў, К.Крапіва ________

______________________________________________

*Заданне 24.* П.Алевінскі, Д.Георгіеўскі, С.Тамашэвіч, Р.Гарашкевіч

___________________________________

*Заданне 25.* П.Ф.Салаўёў, Ф.В.Лунгерсгаўзен, М.Ганчарык

____________________________________________

Репозиторий БГУКИ

## VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 26.* Студэнт БДУ, адзін з арганізатараў краязнаўчага таварыства БДУ, аўтар успамінаў пра станаўленне краязнаўчай працы гэтай арганізацыі, удзельнік краязнаўчых “бадзянняў у 1924–1929 гг.”, у далейшым знакаміты гісторык і крыніцазнавец ________________________________________

*Заданне 27.* Вывучаў птушак і іншых прадстаўнікоў фауны. У 1924 г. у вярхоўях Бярэзіны і яе прытоках знайшоў вялікае паселішча баброў, выступіў з ініцыятывай стварэння запаведніка для захавання каштоўнага і рэдкага на той час віду ___________________________________________________

*Заданне 28.* Прафесар БДУ і старшы навуковы супрацоўнік АН БССР, адзін з актыўных пагромшчыкаў краязнаўства, аўтар артыкула “Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР” _____________________________________________

*Заданне 29.* Заснавальнік Беларускага навуковага таварыства і знакамітага Беларускага музея ў Вільні, апантаны збіральнік старажытнасцей _______________________________

*Заданне 30.* Удзельнік беларускага нацыянальнага руху, стваральнік вядомай прыватнай бібліятэкі ў Вільні, у якой былі багаты фонд выданняў і рукапісаў, прысвечаных беларускім тэрыторыям, а таксама каталог мясцовых (заходнебеларускіх) дакументаў. Меў славу “самага працавітага і найсумленнейшага бібліятэкара, уражваў эрудыцыяй і памяццю бібліёграфа” ____________________________________________

Репозиторий БГУКИ

## Тэст па раздзелу “Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі ў 1946–1980-я гг.”

### I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Рэспубліканскі клуб чырвоных следапытаў школ і пазашкольных установ рэспублікі “Пошук” быў створаны ў _________ г.

*Заданне 2.* У турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі “Моя Родина – СССР” школьнікі Беларусі ўдзельнічалі з ______ г.

*Заданне 3.* У абласных бібліятэках былі створаны _______________________________________ аддзелы/сектары

*Заданне 4.* Значны ўклад у развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці па краязнаўстве ў Беларусі ўнесла галоўны бібліёграф ДБ БССР ____________________________

*Заданне 5.* У снежні 1989 г. было створана ______________ _______________________________________________________

*Заданне 6.* Рэгіянальнае аддзяленне Саюза палякаў на Беларусі пачало выдаваць у г.Ліда перыядычнае выданне ______________________________________________________

### II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 7.* У 1967 г. у Полацку, Заслаўі і Гродне былі створаны:

а) гістарычна-археалагічныя запаведнікі,

б) краязнаўчыя музеі,

в) гістарычна-культурныя запаведнікі.

*Заданне 8.* У якой грамадскай арганізацыі была створана краязнаўчая камісія:

а) Беларускае таварыства аховы прыроды,

б) ЦК ЛКСМБ,

в) Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры,

г) Беларускі фонд культуры.

*Заданне 9.* Мясцовыя грамадскія краязнаўчыя арганізацыі пачалі адраджацца:

а) у канцы 50-х гг.,

б) у пачатку 70-х гг.,

в) у канцы 80-х гг.

*Заданне 10.* Развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў Беларусі ў дарэвалюцыйны і савецкі час даследавалі:

а) В.Е.Лявончыкаў,

б) Л.Р.Амяльковіч,

в) І.Б.Сіманоўскі,

Рэпазіторый БГУКІ

г) Р.М.Чыгірова.

*Заданне 11.* Старшынёй рады БКТ быў абраны:

а) Э.М.Загарульскі,

б) Г.А.Каханоўскі,

в) А.М.Белакоз,

г) Ф.Р.Шкляраў.

**III. Суаднясіце**

*Заданне 12.* Установы і дзеячаў краязнаўства з музеямі, якія былі імі створаны:

| | |
|---|---|
| 1. Ф.Р.Шкляраў | а) Гістарычна-этнаграфічны музей Гудзевічскай СШ |
| 2. А.М.Белакоз | б) Крычаўскі краязнаўчы музей |
| 3. Інстытут геахіміі і геадэзіі АН | в) Веткаўскі музей народнай творчасці |
| 4. М.Ф.Мельнікаў | г) Музей валуноў |

*Заданне 13.* Назвы краязнаўчых выданняў і іх аўтараў

| | |
|---|---|
| 1. Г.А.Каханоўскі | а) "Географическое краеведение" |
| 2. Я.М.Мяшэчка | б) "Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. " |
| 3. Л.В.Аляксееў | в) "Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст." |

IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 14.* У пасляваенны час у Беларусі была адноўлена самастойная краязнаўчая арганізацыя па ўзоры ЦБК.

*Заданне 15.* У краязнаўчым руху прымалі ўдзел ЦК ЛКСМБ, піянерская арганізацыя, добраахвотныя таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры, аховы прыроды, Беларускі фонд культуры.

*Заданне 16.* Найбольш развітой формай краязнаўчага руху з'яўлялася школьнае краязнаўства.

*Заданне 17.* Краязнаўства як вучэбная дысцыпліна ў 60-я гг. увайшло ў праграмы гістарычных і геаграфічных факультэтаў ВНУ.

**V. Што аб'ядноўвае**

*Заданне 18.* М.В.Біч, Л.Р.Казлоў, З.Х.Санько, В.С.Талстой, В.А.Чамярыцкі

______________________________________________

Репозиторий БГУКИ

### VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 19.* Прафесар, арганізатар і кіраўнік гістарычна-краязнаўчага гуртка Гродзенскага педагагічнага інстытута ______________________________________________________________

*Заданне 20.* Вывучаў гісторыю Слонімшчыны і Гродзеншчыны, у гады Вялікай Айчыннай вайны захаваў археалагічную калекцыю створанага ім Слонімскага краязнаўчага музея ________________________________________________________

*Заданне 21.* Галоўны бібліёграф ДБ БССР, унесла значны ўклад у навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве ______________________________________

Репозиторий БГУКИ

## Тэст па раздзелу “Развіццё краязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2010-я гг.)”

### I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* У 1992 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь была зацверджана Усебеларуская турыстычна-краязнаўчая экспедыцыя ______________________________

*Заданне 2.* У абласных аб’яднаннях па арганізацыі пазашкольнай працы функцыянуюць ______________________

*Заданне 3.* “Краязнаўчая газета” выпускаецца з ________ г.

*Заданне 4.* Галоўным рэдактарам “Краязнаўчай газеты” з’яўляецца (адказ даць па ўзоры: В.Скалабан) _____________

*Заданне 5.* Газеты “Лідская зямля” (“Ziemia Lidzka”), “Голас з-над Нёмана” (“Głos znad Niemna”) былі ўтвораны як органы рэгіянальных аддзяленняў _________________________

*Заданне 6.* Найбольш мэтанакіравана і актыўна фарміруе сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў________ __________________________________абласная бібліятэка.

### II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 7.* Устаноўчыя з’езды і канферэнцыі з мэтай адраджэння БКТ адбыліся ў:

а) 1996 г.,

б) 2003 г.,

в) 2005 г.

*Заданне 8.* У Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францішка Скарыны вёўся:

а) банк даных па краязнаўстве,

б) краязнаўчы каталог,

в) фонд краязнаўчых дакументаў аб г.Полацку.

*Заданне 9.* Прафесар В.П.Рагойша стварыў у в.Ракаў Валожынскага раёна:

а) музей політэхнічнай культуры Ракаўшчыны,

б) арт-музей ракаўскай керафондмікі,

в) гістарычна-этнаграфічны музей.

### III. Суаднясіце

*Заданне 10.* Профіль грамадскіх таварыстваў і кірункі іх дзейнасці

| | |
|---|---|
| 1. Краязнаўчыя арганізацыі пры ўстановах | а) Даследаванне пэўнай тэрыторыі і папулярызацыя ведаў аб ёй |
| 2.Вузкапрафіляваныя | б) Даследаванні, прысвечаныя |

Репозиторий БГУКИ

| | |
|---|---|
| краязнаўчыя арганізацыі | ўстановам і іх супрацоўнікам |
| 3.Нацыянальна-культурныя таварыствы | в) Актуальная для рэгіёну тэматыка даследаванняў |
| 4. Краязнаўчыя навуковыя і навукова-асветныя таварыствы | г) Даследаванне мінулага этнасу на пэўнай тэрыторыі, папулярызацыя гістарычна-культурных здабыткаў |

*Заданне 11.* Назвы краязнаўчых арганізацый з іх профілем

| | |
|---|---|
| 1.”Загароддзе” | а) Устанаўленне імён воінаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны |
| 2. Ваенна-гістарычны цэнтр у Смаргоні | б) Выдавецкая дзейнасць, культурна-асветніцкая работа, вывучэнне гісторыі этнічнай супольнасці ў краі |
| 3. Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі | в) Даследаванне Заходняга Палесся |
| 4. Пошукавы клуб Магілёўскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту | г) Падзеі Першай сусветнай вайны |

Репозиторий БГУКИ

**IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем? (Так/Не)**

*Заданне 12.* У пачатку 90-х гг. колькасць вучняў, якія займаліся краязнаўчай работай у школах, скарацілася.

*Заданне 13.* Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства сумесна з Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры і БФК праводзяць рэспубліканскія конкурсы на лепшы праект краязнаўчага маршруту “Мой край”, лепшы музей, пакой, лепшую экспазіцыю прыродазнаўчага профілю.

*Заданне 14.* У Беларусі не вядзецца выданне зборнікаў актавых дакументаў, прысвечаных рэгіёнам.

**V. Што аб’ядноўвае**

*Заданне 15.* “Моя Родина — СССР”, “Наш край”, “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся” – гэта ___________________________

## VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 16.* Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства лічыць, што турыстычна-краязнаўчая дзейнасць "заўсёды стварае аптымістычны настрой, фарміруе станоўчыя эмоцыі ў дачыненні да народных традыцый, культуры, гістарычнага мінулага".

*Заданне 17.* Мастак, стваральнік музея ракаўскай керамікі.

*Заданне 18.* Вядомы віцебскі краязнавец, журналіст, зараз супрацоўнік Віцебскай АБ, аўтар кнігі аб А.П.Сапунове, кіраўнік "Віцебскага краязнаўчага фонду імя А.П.Сапунова" ___________________________________________________

*Заданне 19.* Ураджэнец Заходнепалескага рэгіёну, старшыня навукова-краязнаўчага таварыства "Загароддзе" _________
___________________________________________________

Репозиторий БГУКИ

# ГРАФІК КАНТРОЛЮ ЗА САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ

| № п\п | Тэмы для кантролю па СРС | Форма кантролю | Знаходжанне метадычных матэрыялаў | Тэрмін кантролю | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | № тыд-ня | Месяц |
| 1 | Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах | Праверка пісьмовых паведамленняў, субяседаванне | Вучэбна-метадычны комплекс, 312 каб. Электронная бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў | 2 | люты |
| 3 | Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў у ВКЛ | Праверка пісьмовых паведамленняў, субяседаванне | Там жа | 4 | сакавік |
| 4 | Узнікненне рэгіянальных геаграфічных і прыродазнаўчых апісанняў і даследаванняў у ВКЛ | Праверка пісьмовых паведамленняў, Выступленні на семінары № 1 | Там жа | 5 | сакавік |
| 6 | Кірункі краязнаўчых даследаванняў у 1795 – 1917 гг. | Праверка рэфератаў Выступленні на семінары № 2. | Там жа | 7 | сакавік |
| 8 | Арганізацыя краязнаўства ў БССР у міжваенны перыяд (1918 – чэрвень 1941 гг.), яго страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны | Пісьмовае тэсціраванне. Выступленні на семінары № 3. | Там жа | 9 | красавік |
| 10 | Краязнаўчая дзейнасць у Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) | Праверка пісьмовых паведамленняў, Выступленні на семінары № 3 | Там жа | 11 | красавік |
| 11 | Аднаўленне краязнаўчай дзейнасці ў БССР і яе арганізацыя ў 1945 – 1980-я гг. | Праверка пісьмовых паведамленняў, субяседаванне | Там жа | 12 | красавік |
| 12 | Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў у БССР у 1945– 1980-я гг. | Праверка пісьмовых прац, субяседаванне. | Там жа | 12 | красавік |
| 17 | Развіццё грамадскага краязнаўчага руху (1991 – 2010-я гг.) | Субяседаванне па тэме, выступленні на семінары № 5 | Там жа | 3 | верасень |
| 19 | Асноўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў (1991 – 2010-я гг.) | Дэманстрацыя прэзентацый, выступленні на семінары № 6 | Там жа | 9 | кастрычнік |

Репозиторий БГУКИ

## УМОВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ

### Ранжыраванне відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па дысцыпліне

1. Наведванне лекцый – *2 балы.*

(14 лекцый х 2 бала = 28 балаў)

2. Наведванне семінарскіх заняткаў – *2 балы.*

(6 семінараў х 2бала = 12 балаў)

3. Адказ на семінарскіх занятках – да *10 балаў.*

(9 семінараў х 10 балаў = 90 балаў)

4. Наведванне практычных заняткаў – *2 балы* (5 х 2 = 10 балы)

5. Адзнака за выкананне тэм практычных заняткаў – да 10 *балаў.*

(5 практычных заняткаў х 10 балаў = 50 балаў)

4. СРС – форма кантроля: пісьмовая работа, субясядаванне, выступленне на семінары – да *10 балаў.*

(10 работ х 10 балаў = 100 балаў)

### Прэміяльныя балы

1. Актыўнасць на семінарскіх занятках – *6 балаў.*
2. Аналіз манаграфічных крыніц і артыкулаў з выступленнем перад групай – *10 балаў.*

### Памяншальныя балы

1. Несвоечасовае (без уважлівай прычыны) выкананне заданняў па курсу – *мінус 2 балы.*
2. Адпрацоўка раней непадрыхтаванага семінара, практычнай работы па курсу – *мінус 5 балаў.*

Репозиторий БГУКИ

## ТЭМЫ КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

1.Бібліятэка….. у краязнаўчым руху рэгіёна.
2. Бібліяграфічная інфармацыя ў краязнаўчых перыядычных выданнях міжваеннага часу.
3. Бібліяграфічная інфармацыя ў сучасных краязнаўчых перыядычных выданнях і зборніках.
4. Выдатныя беларускія краязнаўцы XIX ст.: біябібліяграфічны слоўнік.
5. Краязнаўчая фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя ў “Памятных книжках…губернии”
6. …край на старонках раённай газеты “…..”: бібліяграфічны паказальнік.
7. Краязнаўцы …..: біябібліяграфічны слоўнік.
8. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ….. у перыяд …. .

Репозиторий БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*


1. *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 206 с.
2. *Амелькович, Л.Г.* Деятельность Центрального Бюро краеведения Белоруссии (1923–1933) / Л.Г.Амелькoвiч / Минск. гос. пед. ин-т им. М.Горького // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Мн., 1975. – С. 59–77.
3. *Дзянісаў, А.У.* Развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 1920 – 1930-я гг. / А.У.Дзянісаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 4. – С. 24–32.
4. *Каханоўскі, Г.А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 119 с.
5. *Краязнаўства* // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 257–260.
6. *Краязнаўчы* рух // Памяць. Мінск: гіст.-дакум. хроніка. Кн. 3. – Мн.: БЕЛТА, 2004. – С. 205–208.
7. *Кузьмініч, Т.В.* Бібліяграфічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20 – пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т.В.Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С. 204–228.
8. *Лісаў, А*. Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А.Лісаў, А.Падліпскі / Віцеб. краязн. фонд імя А.Сапунова. – Віцебск: Віцеб. абл. друкарня, 2000. – 48 с.
9. *Лявончыкаў, В.Е.* Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: падручнік / В.Е.Лявончыкаў. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991. – С. 78–82, 97–99, 134–135, 157–158, 219–221.
10. *Мешечко, Е.Н.* Географическое краеведение: учеб. пособие / Е.Н.Мешечко. – Мн.: Экоперспектива, 2002. – С. 3–34.
11. *Развитие* исторического краеведения // Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – С. 5–44.
12. *Падліпскі, А.М.* Летапісец Віцебшчыны: А.П.Сапуноў / А.М.Падліпскі. – Мн.: Полымя, 1993. – 92 с.
13. *Півавар, М.В.* Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / М.В.Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 3. – С. 46–52.
14. *Прадзеіна, А.В.* Тэрміналагічныя паблемы краязнаўчай бібліяграфіі Беларусі / А.В.Прадзеіна // Бібліяграфія ў інфармацыйным грамадстве: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. “Бібліятэка ў сучаснай інфармацыйнай прасторы”, Мінск, 23–24 кастр. 1997 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. А.В.Мураўёва. – Мн., 1999. – С. 44–53.


Репозиторий БГУКИ

15. *Саітава, В.І.* Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.
16. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
17. *Саітава, В.І.* Публікацыі грамадскіх краязнаўчых арганізацый як прадстаўленне рэгіянальнай адметнасці ва ўмовах глабалізацыі культуры / В.І.Саітава // Бібліятэчны веснік : зборнік артыкулаў. Вып. 1 / Нацыянальная бібліятэка Беларусі : складальнік М.Г.Алейнік. – Мн. : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2010. – С.71–77.
18. *Цітовіч, І.У.* Заканадаўчыя аспекты краязнаўчага руху Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / І.У.Цітовіч // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 1. – С. 3–10.
19. *Саітава, В.І.* Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк Заходняй Беларусі / В.І.Саітава // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С. 228–236.
20. *Цітовіч, І.У.* Заходнебеларускі школьны краязнаўчы рух у міжваенны перыяд / І.У.Цітовіч // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2003. – № 5. – С. 55–62.
21. *Шацкая, А.Н.* Государственная политика поддержки краеведческого движения в Республике Беларусь – 1991–2003 гг. / А.Н.Шацкая // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: сб. материалов респ. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рождения Ф.В.Зеньковича, 16–17 окт. 2003. – Брест: БрГУ, 2003. – С. 21–25.
22. *Шорац, Л.Ф.* Школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 20–30-я гады ХХ ст. / Л.Ф.Шорац // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2005. – № 4. – С. 36–39.
23. *Шумейко, М.* Белорусские архивы и краеведение в 1920-е годы / М.Шумейко // Архівы і справаводства. – 2003. – № 4. – С. 87–95.

***Дадатковая***

1. *Валахановіч, А.І.* Графы фон Гутэн Чапскія на Беларусі / А.І.Валахановіч. – Мн.: БелНДІДАС, 2003. – 84 с.
2. *Витебщина* архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX–XX в.) – Мн.: БелНИИДАД; Витебск, 2002. – 213 с.
3. *Грабянчук, І.* Краязнаўчы рух і стварэнне першых публічных музеяў у Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / І.Грабянчук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 4. – С. 38–45.
4. *Гужалоўскі, А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 164 с.

Репозиторий БГУКИ

5. *Дзянісаў, А.У.* Краязнаўчы рух у БССР у 30-я гг. ХХ ст. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С. 194–197.
6. *Дзянісаў, А.У.* Напрамкі дзейнасці нацыянальных аддзелаў пры Цэнтральным бюро краязнаўства ў БССР у сярэдзіне 1920-х гг. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Серия, 5, История, философия, филология. – 2010. – Вып. 18. – С.66 – 68.
7. *Дзянісаў, А.У.* Палітыка ўладаў у дачыненні да добраахвотных краязнаўчых арганізацый Беларусі ў 1920–1923 гг. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С. 190–193.
8. *Елизаров, С.А.* Формирование и функционирование административно-территориального деления БССР (1919 – 1991 гг.) / С.А.Елизаров. – Гомель : ГГТУ, 2009. – 222 с.
9. *Прадзеіна, А.В.* Абуджаць гістарычную рамантыку / А.В.Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 30–32.
10. *Раманаў, Е.Р.* З гісторыка-археалагічнай спадчыны: выбраныя творы / Е.Р.Раманаў; пад навук. рэд. І.А.Марзалюка. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – 240 с.
11. *Кравец, А.* Экспедыцыя навучэнцаў “Наш край” / А.Кравец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 6. – С. 61–64.
12. *Кузьмич, А.С.* Краеведческое движение в Гомеле в 20-е годы XX в. / А.С.Кузьмич, А.В.Кузьмич // Краеведческие записки: к 80-летию Гомел. обл. краевед. музея. – Гомель: Гомел. обл. краевед. музей, 2000. – С. 196–203.
13. Лабовіч, Антон. Мудры настаўнік Алесь Белакоз / Антон Лабовіч. – Гродна, 2006. – 71 с.
14. *Локотко, А.И.* Историко-культурные регионы Беларуси: [пособие для студентов отд-ния “Культур. наследие и междунар. туризм” фак. искусств] / А.И.Локотко. – Мн.: ЕГУ, 2002. – 226 с.: ил.
15. *Лыч, Л.М.* Краязнаўства – крыніца ведаў і нацыянальнага сталення / Л.М.Лыч. – Мн.: Бел. фонд культуры, 2004. – 49 с.
16. *Ляшук, В.Я.* Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я.Ляшук, Г.М.Снітко. – Мн.: Литература и искусство, 2008. – 318 с.
17. *Малаш, Ю.* Язэп Драздовіч – вандроўнік, мастак, гісторык / Ю.Малаш // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 78–82.

Репозиторий БГУКИ

18.*Мальдзіс, А.* Скарынаўскі цэнтр і краязнаўства / А.Мальдзіс // Падарожнік. – 1997. – № 1 (укладка паміж с. 10–11).
19. *Мілоста, Н.Н.* Бібліятэчнае краязнаўства – дзейсны сродак дакументнага і бібліяграфічнага забеспячэння краязнаўчага руху Гродзеншчыны / Н.Н. Мілоста, Л.І. Турмасава // 60-летие образования Гродненской области : материалы междунар. науч. конф. – Гродно, 2004. – С. 227 – 234.
20.*Півавар, М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI – 1944 г.: даведнік / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 176 с.: фат.
21.*Саітава, В.І.* Бібліяграфічнае адлюстраванне гісторыі Брэсцкага краю ў часопісе "Ateneum wileńskie"/В.І.Саітава // Берасцейскія кнігазборы : Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Берасцейскія кнігазборы : праблемы і перспектывы даследавання" (Брэст, 30 – 31 кастрычніка 2008 г.) / УК "Абласная бібліятэка імя М. Горкага" ; складальнікі А.М.Мяснянкіна, Т.С.Кавенька. – Брэст, 2010. – С.160 – 167.
22.*Саітава, В.І.* Краязнаўчая работа ў Лідзе (20–30-я гг.) / В.І.Саітава // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 3. – С. 22–23.
23.*Саитова, В.И.* Журнал "Ateneum Wileńskie" / В.И.Саитова // Библиография. – 1999. – № 5. – С. 82–91.
24.*Саламевіч, Я.* Руплівец: [аб Г.А.Кахано́ўскім] / Я.Саламевіч // ЛіМ. – 1996. – 19 студз. (№3). – С. 12.
25.Улейчик, Н. Л. Возрождение и развитие народного творчества в Гродненском регионе в конце XX — начале XXI вв. / Улейчик Н. Л., Змитрович И. О. // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях — С. 121—125.
26.*Цітовіч, І.У.* Аматарскае краязнаўства 1921–1939 гг. і яго месца ў нацыянальна-культурным жыцці заходнебеларускага насельніцтва / І.У.Цітовіч // Философия. Культура. Общество: сб. тр. молодых ученых и аспирантов / РИВШ. – Мн., 2004. – Ч. 1. – С.155 – 163.
27.*Цітовіч, І.У.* Даследаванне Заходняй Беларусі дзяржаўнымі краязнаўчымі арганізацыямі II Рэчы Паспалітай / І.У.Цітовіч // VI межвуз. конф. молодых ученых, Брест, 14 мая 2004 г. / Брест. гос. ун-т им. А.С.Пушкина; под общ. ред. А.А.Горбацкого. – Брест, 2004. – С. 148–150.
28.*Цітоў, А.* Кароткі летапіс пра летапісца: А.Гваньіні / А.Цітоў // Мастацтва. – 1993. – № 8. – С. 64–65.

Репозиторий БГУКИ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Загадчык кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
____________ Касап В.А.

____ __________ 2015 г.

**Пералік тэарэтычных пытанняў** да заліку па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі”

1. Узнікненне і развіццё адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу беларускіх зямель у перыяды ВКЛ і Расійскай імперыі.
2. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР (1918 – 1990 гг.) і заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы (1921 – 1939 гг.)?
3. Характарыстыка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Рэспублікі Беларусь.
4. Рэгіянальнае раяніраванне Беларусі па прыродна-геаграфічнай і эканамічнай прыметах
5. Краязнаўчыя апісанні і даследаванні геаграфіі і прыроды беларускіх рэгіёнаў ВКЛ у перыяд сярэдзіна XV ст. – да I795 г.
6. Уклад у гісторыка-краязнаўчыя даследаванні беларускіх рэгіёнаў ВКЛ унеслі М.Стрыйкоўскага, А.Гваньіні і Я.Ласіцкага.
7. Роля В.Каяловіча, А.Нарушэвіча і І.Сцябельскага ў гісторыка-краязнаўчых даследаваннях беларускіх рэгіёнаў у ВКЛ.
8. Краязнаўчыя даследаванні Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.
9. Краязнаўчая дзейнасць у вышэйшых навучальных установах на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст.
10. Краязнаўчая дзейнасць Т.Нарбута, З.Даленгі-Хадакоўскага і А.Кіркора.
11. Дзейнасць грамадскіх краязнаўчых арганізацый у першай палове– сярэдзіне 60- х гадоў XIX ст.
12. Уклад Яўстаха Тышкевіча ў арганізацыю грамадскага краязнаўчага руху ў першай палове-сярэдзіне XIX ст.
13. Краязнаўчая дзейнасць Паўночна-Заходняга аддзела РГТ, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і царкоўна-археалагічных камітэтаў.
14. Значэнне комплексных краязнаўчых даследаванняў К.Тышкевіча, П.Шпілеўскага, У.Сыракомлі.
15. Краязнаўчая дзейнасць А.П.Сапунова, М.Я.Нікіфароўскага, Е.Р.Раманава.
16. Дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў і Генштаба Расійскай арміі па вывучэнні беларускіх губерняў.
17. Роля Археаграфічнай камісіі, Віленскага і Віцебскага архіваў старажытных актаў у вывучэнне беларускіх рэгіёнаў.
18. Краязнаўчая дзейнасць А.К.Ельскага і Э.Гутэн-Чапскага.
19. Значэнне краязнаўчых перыядычных выданняў XIX – пачатку XX стст.
20. Арганізацыйная структура грамадскага краязнаўчага руху ў БССР у міжваенны перыяд (I9I8-I94I гг.).

Рэпазіторый БГУКИ

21. Роля Цэнтральнага бюро краязнаўства ў арганізацыі краязнаўчага руху ў БССР у міжваенны перыяд (I9I8-I94I гг.).
22. Краязнаўчыя даследаванні прыроды, санітарна-гігіенічных умоў і рэгіянальных захворванняў у БССР у міжваенны перыяд (1918 – 1941 гг.).
23. Вынікі гісторыка-краязнаўчых даследаванняў Інбелкульта і АН БССР у міжваенны перыяд (I9I8 – I94I гг.).
24. Краязнаўчыя даследаванні Інбелкульта і АН БССР па мастацтве і зборы слоўнага матэрыялу ў міжваенны перыяд (I9I8 – I94I гг.).
25. Краязнаўчая дзейнасць нацыянальных беларускіх арганізацый і ўстаноў у Заходняй Беларусі (I921-I939 гг.).
26. Дзейнасць Польскага краязнаўчага таварыства на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.
27. Краязнаўчая дзейнасць М.І.Каспяровіча.
28. Значэнне часопіс "Наш край" у развіцці краязнаўчага руху ў БССР у міжваенны перыяд.
29. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці ў БССР у пасляваенны перыяд (1945 – 1980-я гг.).
30. Краязнаўчая дзейнасць дабраахвотных грамадскіх арганізацый у БССР у 1945 – 1980-я гг.
31. Развіццё школьнага краязнаўства ў БССР у пасляваенны перыяд (1945 — 1980-я гг.).
32. Роля музеяў у развіцці краязнаўства ў БССР у пасляваенны перыяд (1945 – 1980-я гг.).
33. Дасягненні і праблемы грамадскага краязнаўчага руху ў Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2010-я гг.).
34. Развіццё школьнага краязнаўчага руху на сучасным этапе (1991 – 2010-я гг.)
35. Дасягненні і праблемы грамадскага краязнаўчага руху ў Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2010-я гг.).
36. Дзейнасць Беларускага краязнаўчага таварыства (1989- 2004 г.).
37. Краязнаўчая дзейнасць БФК і іншых рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў на сучасным этапе.
38. Краязнаўчая дзейнасць у ВНУ на сучасным этапе.
39. Развіццё сеткі краязнаўчых музеяў на сучасным этапе, асноўныя кірункі іх дзейнасці.
40. Дзейнасць архіваў і Археаграфічнай камісіі па падрыхтоўцы публікацый сборнікаў дакументаў, прысвечных рэгіёнам Беларусі.
41. Развіццё школьнага краязнаўчага руху на сучасным этапе (1991 – 2010-я гг.)
42. Роля "Краязнаўчай газеты" ў інфармацыйным адлюстраванні праблем сучаснага краязнаўства.
43. Развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства на сучасным этапе.
44. Дасягненні і праблемы грамадскага краязнаўчага руху ў Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2010-я гг.).

Репозиторий БГУКИ

45. Дасягненні ў этнаграфічных даследаваннях рэгіёнаў Беларусі на сучасным этапе.
46. Дасягненні ў вывучэнні археалогіі рэгіёнаў Беларусі на сучасным этапе.

Выкладчык
________________В.І. Саітава

Разгледжаны на пасяджэнні
кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
пратакол №_____ад ____
___________2015 г.

Репозиторий БГУКИ

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭХНІЧНЫХ СРОДКАЎ

У мэтах паляпшэння нагляднасці лекцыйнага матэрыялу выкарыстоўваюцца электронныя прэзентацыі ў праграме Power Point па тэмах:

1. Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў беларускіх зямель у ВКЛ.

2. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1795 – 1864 гг.

3. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства ў 1864 – 1917гг.

4. Аднаўленне краязнаўчай дзейнасці ў БССР і яе арганізацыя ў 1945 – 1980-я гг.

Репозиторий БГУКИ